Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

18 СТУДЗЕНЯ 2008 г. ПЯТНІЦА
№ 10 (26123)
Кошт 490 рублёў
ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Прамая лінія

ВАЛОДАЦЬ ПРЫГОЖАЙ СКУРАЙ — ВАЛОДАЦЬ УДАЧАЙ

Хваробы скуры — не толькі непрыемныя і пагаршаюць якасць жыцця. Яны яшчэ зусім не бяскрыўдныя, працягла лечацца і прыносяць сур'ёзныя ўскладненні. Герпес, напрыклад, можа скончыцца лішаём зосцера, мікозы (грыбковыя захворванні скуры) — рожыстым запаленнем, нямала праблем нясуць атапічныя дэрматыты і псарыязы. Таму не варта адразу кідацца лячыць свае балячкі мазямі, якія актыўна рэкламуюцца: трэба абавязкова звярнацца па кансультацыю да дэрматолага. Такога спецыяліста мы запрасілі на «прамую лінію». У ёй возьме ўдзел урач-дэрматавенеролаг загадчык амбулаторнага дэрматавенералагічнага аддзялення Мінскага скурвендыспансэра Уладзімір Іванавіч Яроміч.

«Прамая лінія» адбудзецца **24 студзеня** ў чацвер **з 15.00 да 16.30** па нумарах 8 (017) 292 38 92 і 292 38 21. Папярэднія пытанні можна пакінуць па нумарах 8 (017) 287 18 29 (Святлана Барысенка) і 287 18 36 (Вольга Шаўко).

Нягледзячы на знешні націск, у Беларусі неабходна вырашыць намечаныя сацыяльна-эканамічныя задачы

Працэс ратацыі кіруючых кадраў у Беларусі будзе прадоўжаны. Аб гэтым паведаміў учора кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка, прадстаўляючы Мікалая Дамашкевіча на пасадзе Кіраўніка спраў Прэзідэнта Беларусі. «Перад намі стаяць сур'ёзныя задачы. Улада не павінна быць раз і назаўсёды застылай. Таму будуць праводзіцца змяненні, адпаведныя ратацыі», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Паводле яго слоў, «ва ўладзе на пасады павінны прыйсці ініцыятыўныя людзі, якія добра сябе зарэкамендавалі». Кадравыя перастаноўкі — гэта натуральны працэс, і з гэтага не трэба рабіць нейкую надзвычайную падзею, дадаў Прэзідэнт. Аляксандру Кулічкову, які раней займаў пасаду Кіраўніка спраў Прэзідэнта Беларусі, будзе прапанавана высокая пасада ў структуры Саюзнай дзяржавы, паведаміў кіраўнік дзяржавы. Ён падзякаваў Аляксандру Кулічкову за работу і падкрэсліў, што яго прафесійныя якасці будуць запатрабаваныя.

Беларускі лідар назваў заслугай Аляксандра Кулічкова тое, што яму ўдалося выбудаваць і сістэмна арганізаваць работу Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта, перавесці яе «на эканамічныя рэйкі». Ацэньваючы дзейнасць Кіраўніцтва справамі, Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што тут сітуацыя нядрэнная. Аб'ём вытворчасці прамысловай прадукцыі ў мінулым годзе павялічаны амаль на 19 працэнтаў, на 14 працэнтаў вышэй за прагнозны паказчык выпушчана прадукцыі сельскай гаспадаркі. Разам з тым, паводле слоў кіраўніка дзяржавы, «трэба яшчэ паднапружыцца». «Кіраўніцтва справамі павінна быць прыкладам для іншых. Для дасягнення новых задач нам патрэбны энергічны, прынцыповы, напорысты чалавек», — сказаў Прэзідэнт.

Паводле яго слоў, дзякуючы свайму крутому, рэзкаму характару Мікалай Дамашкевіч дапамог у свой час накіраваць у патрэбнае рэчышча работу Мінскай вобласці. «Там шмат зроблена. І, разглядаючы некалькі кандыдатур, я аддаў перавагу яму», — дадаў Аляксандр Лукашэнка. Паводле яго слоў, у сістэме Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта сёння працуюць каля 25 тыс. чалавек. «Гэта вялікая структура, якая павінна прыносіць карысць дзяржаве. Сёння неабходна дабіцца павышэння эфектыўнасці работы падведамных Кіраўніцтву справамі прадпрыемстваў і арганізацый. Прагнозныя паказчыкі павінны выконвацца, трэба павялічваць розначны тавараабарот, разабрацца са стратнымі прадпрыемствамі», — падкрэсліў Прэзідэнт. «Неабходна сур'ёзна паглядзець на ўсіх арганізацыях, — адзначыў кіраўнік дзяржавы, звяртаючыся да Мікалая Дамашкевіча. — Прадпрыемствы павінны даваць у два разы больш прадукцыі. Пытанне не ў тым, каб людзей скарацыць, а ў тым, што прадукцыйнасць працы трэба павысіць як мінімум у два разы. Я стаўлю такія сур'ёзныя задачы, паколькі размова ідзе аб прадпрыемствах Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта. На вас жа ўсе глядзяць і арыентуюцца».

Пры гэтым кіраўнік дзяржавы перасцярог ад празмернага захаплення лічбамі. «Важна канкрэтна разабрацца па кожнаму прадпрыемству, паглядзець, што ляжыць у аснове прыбытку. Нам патрэбна рэальны, зароблены прыбытак, за кошт аб'ектыўнага росту, а не за кошт маніпуляцыі статыстыкай», — дадаў ён.

«Кожнае прадпрыемства павінна працаваць, не спадзеючыся на нейкія датацыі. Зарабляйце грошы, інвесціруйце ў свае сферы і давайце вынік. Гэта, дарэчы, датычыцца і ўсіх прадпрыемстваў у нашай краіне. Хопіць датаваць абібокаў за кошт добра, прыбыткова працуючых прадпрыемстваў. Гэта практыка павінна адысці ў нябыт. І пачынаць будзем з Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта», — заявіў Аляксандр Лукашэнка. Звяртаючыся да Мікалая Дамашкевіча, кіраўнік дзяржавы падкрэсліў: «Часу на разварушванне няма».

У Беларусі неабходна павялічваць уласную вытворчасць рыбнай прадукцыі, а таксама яе імпарт. Адпаведныя ўказанні даў кіраўнік дзяржавы. Паводле яго слоў, Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта адыгрывае вядучую ролю ў пытаннях забеспячэння насельніцтва рыбнай прадукцыяй. «І этай праблемай папрашу прынцыпова заняцца. Мы завозім і спажываем рыбы вельмі мала ў параўнанні з савецкім часам. А рыбная прадукцыя для нашага народа вельмі неабходная. Але галоўнае — нарошчваць вытворчасць рыбы ў нашых сажалках і азёрах», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Мікалаю Дамашкевічу, паводле слоў беларускага лідара, трэба будзе развіваць турыстычную інфраструктуру, у тым ліку ў нацыянальных парках, прыняць меры па павышэнню ўзроўню паслуг у беларускіх санаторна-аздараўленчых арганізацыях. «Вы маеце вельмі моцную матэрыяльную базу для падтрымання здароўя нашых людзей. Я чакаю ад санаторыяў і прафілакторыяў прыклад таго, як трэба працаваць без датацый дзяржавы», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Асаблівую ўвагу Кіраўніцтву справамі Прэзідэнта належыць звярнуць на прадпрыемствы і арганізацыі, размешчаныя ў малых гарадах і населеных пунктах, дадаў Прэзідэнт.

Нягледзячы на знешні націск і запалохванне, у Беларусі неабходна вырашыць намечаныя сацыяльна-эканамічныя задачы, заявіў кіраўнік дзяржавы.

«Гэта трэці год пяцігодкі. Калі мы добра папрацуем у гэты год, то пяцігодка будзе перавыканана. Значыць, мы зможам прыбавіць у эканамічным развіцці дзяржавы. Сёння ў краіне ёсць магчымасці падвоіць тое, што дасягнута», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

«У гэтым годзе трэба папрацаваць так, каб людзі сказалі: нам не патрэбны ўсе гэтыя льготы, нам за гэты год далі ў два разы больш, чым мы атрымлівалі па льготах. Трэба імкнуцца даць людзям нармальную зарплату, пенсіі, стыпендыі і дапамогі», — заявіў кіраўнік дзяржавы. Прэзідэнт падкрэсліў неабходнасць больш эфектыўна выкарыстанне аб'ектаў нерухомай маёмасці дзяржаўнай формы ўласнасці. Кожны метр, паводле яго слоў, павінен не пуставаць, а прыносіць даход дзяржаве.

Аляксандр Лукашэнка ўручыў Мікалаю Дамашкевічу пасведчанне Кіраўніка спраў Прэзідэнта і павішаваў з уступленнем на пасаду.

БЕЛТА.

«САЮЗНЫ КАЛІДОР»

Для больш зручнага перасячэння мяжы грамадзянамі Беларусі і Расіі плануецца стварыць у пунктах прапуску асобныя «зялёныя калідоры». Да такой высновы прыйшлі ўдзельнікі сумеснай калегіі пагранічнага і мытнага камітэтаў нашай краіны. Як патлумачыў начальнік прэс-цэнтра Дзяржаўнага пагранічнага камітэта Беларусі Аляксандр Цішчанка, практыка выдзялення сваіх грамадзян з агульнай плыні існуе ў многіх дзяржавах свету. Напрыклад, падобныя «прэферэнцыі» прадастаўляюць сваім людзям краіны Еўрапейскага саюза. «Беларусы і расіяне, якія жывуць у Саюзнай дзяржаве, таксама павінны мець аналагічныя «прывілеі», — адзначыў Аляксандр Цішчанка. Сёлета плануецца таксама ва ўсіх пунктах пропуску ўкаранішь прынцып «аднаго прыпынку». Сутнасць яго ў тым, што пры ўездзе ў Беларусь на легкавым аўтамабілі грамадзяніну ў пункце пропуску неабходна зрабіць толькі адзін прыпынак замест чатырох. Асобам, якія пакідаюць нашу краіну, трэба спыняцца двойчы. Падчас «абкаткі» памянёнага прынцыпу ў «Катлоўцы» ў сярэднім адна легкавушка затрымлівалася на мяжы ўсяго 3 хвіліны.

Мікола ДЗЯБЁЛА.

Минский городской центр недвижимости проводит аукционы по продаже:

пятикомнатной квартиры на проспекте Независимости, 76а в г. Минске (153,5 кв. м);

двухкомнатной квартиры на проспекте Машерова, 76 в г. Минске (46,9 кв. м);

гаража в гаражном массиве «Северный» на ул. Ангарская, 100 (20,6 кв. м);

бокса для хранения автомобилей в кооперативе «Восток-1» на ул. Калиновского, д. 119 (53,1 кв. м).

Телефоны: (017) 227 48 36, 227 40 22.

УНП 190398583

ПА ЛЮБОВІ!

Учора ў пасёлку Траскоўшчына, што за 55 кіламетраў ад Мінска, я даведалася, як атрымліваюцца шматдзетныя сем'і. Важныя толькі дзве ўмовы. Першая (не смейцеся!) — каб мужчына і жанчына сустрэлі адно аднаго. Другая — каб яны адно аднаго пакахалі. Усё. Далей само сабой. Я добра ведаю ўсе аргументы, якія могуць прагучаць супраць сказанага. Але цяпер, пазнаёміўшыся з сям'ёй Тарбенкаў, абвергну любы.
(Заканчэнне на 2-й стар.)

Сёрца краіны — Міншчына

Леанід КРУПЕЦ, старшыня Мінскага аблвыканкама:

«УСЕ ПЕРАЎТВАРЭННІ — У ІНТАРЭСАХ ЧАЛАВЕКА»

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Гэты калядны тыдзень для жыхароў Міншчыны па-асабліваму адметны — у цэнтральным рэгіёне ўрачыста адзначаецца 70-годдзе ўтварэння вобласці. Менавіта 15 студзеня 1938 года на першай сесіі Вярхоўнага Савета СССР была прынята сапраўды гістарычная пастанова «Аб змяненні і дапаўненні артыкулаў Канстытуцыі СССР», у адпаведнасці з якой у БССР уводзілася абласное адміністрацыйнае дзяленне. Такім чынам, разам з іншымі тэрытарыяльнымі ўтварэннямі на карце нашай дзяржавы і з'явілася Мінская вобласць. Цікава, што на той час у яе склад увайшоў 21 раён: Барысаўскі, Бягомльскі, Грэскі, Дзяржынскі, Заслаўскі, Крупскі, Капыльскі, Лагойскі, Любанскі, Мінскі, Плешчаніцкі, Пухавіцкі, Рудзенскі, Смалявіцкі, Слуцкі, Старадарожскі, Старобінскі, Уздзенскі, Халопеніцкі, Чэрвеньскі і Чырвонаслабодскі. Зразумела, на працягу сямі дзесяцігоддзяў адбылося шмат розных падзей, аднак адно застаецца нязменным: цэнтральны рэгіён шмат у чым вызначальны для ўсяго народнагаспадарчага комплексу краіны. Ратныя і працоўныя дасягненні Міншчыны адзначаны двума ордэнамі Леніна — гэтыя высокія адзнакі дзяржаўныя ўзнагароды вобласць атрымала ў 1967 і 1970 гадах. Свайго высокага ўзроўню «юбіляр» не губляе і цяпер, сведчанне таму — важкія паказчыкі сацыяльна-эканамічнага развіцця, з якімі тут паспяхова спраўляюцца. Аб выніках і планах на перспектыву карэспандэнт «Звязды» гутарыць са старшынёй Мінскага аблвыканкама Леанідам КРУПЦОМ.

«Заробкі залежаць ад эканомікі»

— Павелічэнне дабрабыту людзей, рост грашовых даходаў — сапраўды стратэгічная задача, адзін з асноўных дзяржаўных прыярытэтаў, — заўважае Леанід Фёдаравіч. — Аднак тут трэба дакладна разумець, што павышэнне заробкаў адбываецца толькі ў выніку дынамічнага развіцця эканомікі. Па выніках мінулага года сярэдні памер аплаты працы ў Мінскай вобласці склаў 672 тысячы рублёў, што амаль на 19 працэнтаў больш, чым пазалетась. Гэта яскравае адлюстраванне ўсіх тых станоўчых працэсаў, якія адбываюцца ў сацыяльна-эканамічным развіцці. Як па выніках мінулага года, так і за час, што прайшоў з пачатку бягучай пяцігодкі, выканана большасць плановых прагнозных паказчыкаў.

Зараз аснову эканомікі Міншчыны складае прамысловы комплекс, які мае рознагаліновую накіраванасць. На тэрыторыі вобласці працуе больш чым 4 тысячы прамысловых прадпрыемстваў. На іх долю прыпадае каля 14 працэнтаў рэспубліканскага аб'ёму вытворчасці прамысловай прадукцыі і амаль 16 працэнтаў — спажывецкіх тавараў. У вобласці скандэнтраваны ўвесь выпуск калійных угнаенняў, больш чым 70 працэнтаў — макаронных вырабаў, 57,6 — цукру, 48,6 — трыкатажных вырабаў, 43,3 працэнта — безалкагольных напояў. Сярод галін прамысловасці найбольшая ўдзельная вага ў машынабудаванні і металапрацоўцы, хімічнай і нафтахімічнай, лясной, харчовай, дрэваапрацоўчай і цэлюлозна-папяровай, лёгкай. Па асобных відах прадукцыі за апошнія гады вытворчыя паказчыкі павялічыліся ў некалькі разоў. На тэрыторыі цэнтральнага рэгіёна размешчаны дзесяткі прадпрыемстваў рэспубліканскага значэння, асобныя з іх (да прыкладу, вытворчае аб'яднанне «Беларуськалій» або Беларускі аўтамабільны завод) з'яўляюцца сапраўды сусветнымі брэндамі. Неаспрэчным з'яўляецца той факт, што Мінская вобласць шмат у чым вызначае асаблівасці эканамічнага развіцця.

Стратэгічны накірунак у развіцці эканомікі рэгіёна (як, дарэчы, і ўсёй дзяржавы) — змяншэнне агульных выдаткаў вытворчасці, сабекошту прадукцыі, штогадовае скарачэнне матэрыяла- і энергаёмістасці валавога ўнутранага прадукту. Пастаянна адбываецца пераабсталяванне прамысловых прадпрыемстваў, асвойваюцца і ўкараняюцца сучасныя тэхналогіі. Апошнім часам ва ўсіх галінах адзначаецца актывізацыя інвестыцыйнай дзейнасці. Найбольшая доля інвестыцый прыпадае на прамысловасць (29 працэнтаў), сельскую гаспадарку (23 працэнты), будаўніцтва жылля (20 працэнтаў), а таксама транспарт і сувязь (8 працэнтаў). Надзвычай паказальная такая лічба: летась у параўнанні з 1998 годам інвестыцыі ў асноўны капітал павялічыліся больш чым у 1,9 раза. Як бачым, заўважны рост адзначаецца па многіх накірунках...

«Мадэрнізацыя перш за ўсё»

— ... у тым ліку і ў аграпрамысловым комплексе?

— Для аграпрамысловага комплексу мінулы год атрымаўся асабліва ўдалым: па выніках жніва вобласць прызнана пераможцам рэспубліканскага спаборніцтва — валавы збор збожжа перавысіў 1,8 мільёна тон. А разам з кукурузай вытворчасць збожжавых і зернебабовых перасягнула сапраўды адметную мяжу — 2 мільёны тон. У 14 сельскагаспадарчых арганізацыях у сярэднім было намалочана па больш чым 50 цэнтнераў з гектара. А ў рэспубліканскім унітарным эксперыментальна-доследным сельскагаспадарчым прадпрыемстве «Усход» Мінскага раёна з кожнага гектара летась атрымалі 72 цэнтнеры збожжа, у агракамбінаце «Сноў» — 84,1. Станоўчыя тэндэнцыі заўважныя не толькі ў раслінаводстве, але і ў жывёлагадоўлі. Летась аб'ём валавой вытворчасці малака склаў звыш 1,2 мільёна тон, а сярэдні надой ад каровы — больш чым 4,5 тысячы кілаграмаў. Гэта амаль удвая перавышае паказчык, што быў дасягнуты ў 1998 годзе. На выніках мінулага года 5-тысячны надой ад каровы перавышаны адразу ў чатырох раёнах — Клецкім, Мінскім, Смалявіцкім і Слуцкім, а ў Нясвіжскім — 6393 кг. Вытворчасць жывёлагадоўчай прадукцыі рэальна дазваляе ўмацоўваць эканамічны стан гаспадарак, паколькі цяпер на яе павышаны попыт.

Таму з рэалізацыяй перашкод не ўзнікае — адкрытыя многія рынкі збыту. Прадукцыя запатрабаваная не толькі ў Расіі (на долю якой прыпадае вялікая частка харчовага экспарту), але і ў шэрагу краін далёкага замежжа, у тым ліку ў дзяржавах Азіі і Афрыкі. Каб забяспечыць канкурэнтаздольнасць прадукцыі, зменшыць затраты і палепшыць якасць, актыўна праводзіцца мадэрнізацыя прадпрыемстваў перапрацоўкі. За апошнія гады адбылося тэхнічнае пераўзбраенне шэрагу мясакамбінатаў, малочных заводаў. Сёлета грунтоўнае тэхнічнае абнаўленне чакае і агародніцкую галіну: будзе завершана будаўніцтва 13 сховішчаў, а таксама праведзена рэканструкцыя трох кансервавых заводаў.

— Леанід Фёдаравіч, якія тут існуюць праблемы?

— На жаль, даводзіцца канстатаваць, што імпартуем не толькі цытрусавыя ці нейкую там экзатычную садавіну, завозім тыя ж яблыкі, грушы, слівы, якія цудоўна растуць і ў нашых кліматычных умовах. Тут не варта нешта звышнатуральнае выдумляць, неабходна ўкараніць сучасныя тэхналогіі вытворчасці, перапрацоўкі і захоўвання, тады і з забеспячэннем патрэб унутранага рынку, з рэалізацыяй будзе ўсё ў парадку.

Пераўзбраенне адбываецца, аднак не такімі тэмпамі, як хацелася б. І гэта датычыцца не толькі агародніцкай галіны. Аднак відавочна, што адбываюцца зрухі да лепшага — штогод узводзяцца дзесяткі сучасных малочнатварных фермаў з даільнымі заламі, адбываецца рэканструкцыя асноўных вытворчых памяшканняў. У гэтай важнай справе наладжваецца актыўнае супрацоўніцтва з Мінскам: на долю аграпрамысловых прадпрыемстваў цэнтральнага рэгіёна прыпадае значная доля паставак сельскагаспадарчай прадукцыі ў сталіцу (42,7 працэнта мяса і мясапрадуктаў і 61,4 — малака і малочнай прадукцыі). Дарэчы, гэта абавязковая ўмова, паколькі пастаўкі за мяжу адбываюцца ніколькі не ва ўрон забеспячэнню патрэб унутранага рынку, а асноўны наш спажывец — горад Мінск. Не дзіўна, што гарадскія ўлады праяўляюць вялікую зацікаўленасць у тым, каб на Міншчыне павялічваліся аб'ёмы вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі. Зараз адпрацоўваецца прапанова наконт узвядзення сумесных намаганнямі (сталіцы і вобласці) некалькіх сучасных малочнатварных фермаў з даільнымі заламі, а таксама кансервавага завода.

«З'яўляюцца новыя магчымасці»

— Ці атрымліваецца ў сельгаспадпрыемстваў забяспечваць рэнтабельную работу?

— Аграпрамысловы комплекс заўсёды патрабуе пэўнай дзяржаўнай падтрымкі. Зразумела, з кожным годам у шэрагу сельскагаспадарчых прадпрыемстваў эканамічныя паказчыкі паляпшаюцца, аднак рост цэнаў на запчасткі, угнаенні, гаруча-змазачныя матэрыялы заўсёды апярэджвае павелічэнне тых жа закупачных цэнаў, якое адбываецца, каб падтрымаць вытворчасць. Аднак існуе нямала прыкладаў, калі гаспадаркі нават у такіх даволі складаных умовах забяспечваюць стабільнае, устойлівае развіццё. Зараз праводзіцца работа па аптымізацыі памераў сельгаспадпрыемстваў — вывучаецца пытанне наконт таго, колькі да прыкладу, небходна апрацоўваць ворыва, якое пагалоўе жывёлы вырошчваць, каб была магчымасць для забеспячэння пашыранага ўзнаўлення. У такім выпадку не ўзнікне пытанняў наконт своечасовай выплаты заработнай платы, набыцця неабходнай тэхнікі, угнаенняў і інш. Падчас абароны бізнэс-планаў раёнаў мы ўсё гэта дакладна адсочваем.

— Наколькі дзейсная падтрымка аказваецца прысядзібным гаспадаркам?

— Неабходнасць павелічэння вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі ў грамадскім сектары ў пэўнай меры абумоўлена змяншэннем аб'ёмаў у прыватнікаў.

(Заканчэнне на 2-й стар.)

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

АБАРОТНЫЯ ПАДАТКІ ПЛАНУЕЦЦА ЦАЛКАМ АДМЯНІЦЬ ПРАЗ 3 ГАДЫ

Аб гэтым учора паведаміў журналістам начальнік галоўнага ўпраўлення падатковай палітыкі і даходаў бюджэту Мінфіна Беларусі Аляксандр Казлякоў.

Спецыяліст адзначыў, што абаротныя падаткі з выручкі сёлета паменшыліся на 1 працэнт і складаюць 2 працэнты. Цяпер разглядаецца магчымасць паэтапнага зніжэння стаўкі гэтага падатку, каб дасягнуць поўнай адмены яго з першых дзён 2011 года.

Намеснік міністра па падатках і зборах Ларыса Кандратава нагадала, што сёлета адменены падатак з карыстальнікаў аўтамабільных дарог, адлічэнні ў дзяржаўны бюджэтны фонд развіцця навукі Мінбудархітэктуры, а таксама зборы па лініі будаўніцтва і ажыццяўленню гандлю, якія ўстанаўліваліся мясцовымі органамі ўлады. Не трэба будзе сёлета плаціць збор за размяшчэнне вонкавай рэкламы.

Істотнае спрашчэнне ў 2008 годзе дасягнута па методыцы разлікаў экалагічнага падатку. Цяпер плата экалагічнага падатку за выкіды рэчываў, якія забруджваюць навакольнае паветра, будзе ажыццяўляцца толькі па 46 асноўных шкодных рэчывах, а не па 600 падобных пунктах, як гэта было раней.

Адказваючы на пытанні журналістаў, Аляксандр Казлякоў паведаміў, што, магчыма, у наступным годзе сістэму спагнання падаходнага падатку чакаюць істотныя змяненні. Аднак, паводле меркавання спецыяліста, у праекце магчымых змяненняў нават не разглядаецца пераход да адзінай плоскай шкалы спагнання падаходнага падатку, бо ў гэтым выпадку ўзнікае ўзмацненне аспекту сацыяльнай няроўнасці. Самым перспектыўным «канкурэнтам» існуючай сістэме з'яўляецца варыянт пераходу на двухузроўневую шкалу спагнання падаходнага падатку ў памеры 10 і 15 працэнтаў.

Сяргей КУРКАЧ.

УДАЧА ЎСМІХНУЛАСЯ ПАШТАВІКУ

У апошнім мінулагоднім тыражы латарэі «Гамяльчанка» была разыграна вялікая колькасць бытавой і электроннай тэхнікі, залатыя зліткі, ювелірныя вырабы і буйныя грашовыя сумы — ад 100 тысяч да 10 мільёнаў рублёў. Апошні з'яўляўся галоўным прызам тыражу. Ён дастаўся аператару Веткаўскага раённага вузла паштовай сувязі Ларысе Гаўрылавай.

А ўсяго за мінулы сезон, як паведаміў нам дырэктар даччынага абласнога ўнітарнага прадпрыемства «Гомельлатарэя» Леанід Кандратаў, у ліку галоўных прызоў былі разыграны дзевяць легкавых аўтамабіляў, аднапакаёвая кватэра, шэсць выйгрышаў на дзесяць мільёнаў рублёў, камп'ютары, халадзільнікі, пыласосы і шмат іншых дарагіх рэчаў. У выйгрышы былі жыхары практычна ўсіх гарадоў і раёнаў вобласці. У абласны бюджэт паступіла звыш трохсот мільёнаў дадатковых даходаў.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

ВЕЛЬМІ СПЯШАЛАСЯ

і засталася без машыны, добра яшчэ, што жывой. Жыхарка Жабінкі на чыгуначным пераездзе хацела праскочыць на чырвонае святло, якое папярэджвае аб набліжэнні цягніка. Але на самім пераездзе машына нечакана заглохла, і тут жа паказаўся цеплавоз.

Жанчына выскачыла з аўтамабіля. На яе знакі машыніст адрэагаваць не мог, бо састаў рухаўся з хуткасцю больш за сто кіламетраў у гадзіну. І машыну працягнула па рэйках некалькі кіламетраў. Вядома, «Форд» пасля такога «марафону» ператварыўся ў металалом. А нядбайнаму вадзіцелю давядзецца заплаціць за пашкоджаны электравоз і кампенсаваць выдаткі чыгункі за парушэнне графіка руху транспарту.

Яна СВЕТАВА.

ЗАСТАЛІСЯ БЕЗ АДЗЕЖЫ

невядомыя кантрабандысты ў Брэсце.

У цягніку Варшава—Масква работнікі мытні знайшлі больш за тры сотні прадметаў жаночай вопраткі. Касцюмы і сукенкі былі схаваныя ў матрацах і навалачках купэ аднаго з вагонаў. І пасажыры, і праваднікі адмовіліся прызнаць сябе гаспадарамі тавару, кошт якога перавышае 20 мільёнаў рублёў. Уся кантрабанда была канфіскавана. Парадак яе рэалізацыі вызначыць суд.

Яна СВЕТАВА.

КАЛІ Б НЕ СЛЕСАР...

То магла б здарыцца бяда. З-за таго, што ў адным з пакояў інтэрната Мазырскага ўпраўлення трэста «Белсантэхмантаж» з-за парушэння правілаў пажарнай бяспекі ўзнік агонь і дым ад яго выбіўся ў калідор пятага паверха.

Першым гэта ўбачыў і адчуў слесар, які жыў са сваім братам побач з тым пакоем. Хлопцы, ведаючы аб тым, што ў ім знаходзіўся на той час сусед, кінуліся туды і разбудзілі яго. Дзякуючы такому ўчынку, ніхто не пацярпеў. Работнікі службы МНС, якія прыбылі на месца здарэння, хутка справіліся з «чырвоным пеўнем».

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

ФЛІКЕР РАЗАМ З БІЛЕТАМ «ВАША ЛАТО»

Брэсцкія работнікі аўтаінспекцыі актыўна наведваюць дзіцячыя садкі і школы. У ходзе аперацыі «Будзь адметным, не гуляй з небяспекай» дзецям расказваюць аб правілах паводзінаў пешаходаў і ўручаюць флікеры. А цяпер да акцыі далучыліся прадстаўнікі латарэі «Ваша лато». Юным удзельнікам руху прама на вуліцы будуць дарыць флікеры разам з латарэйнымі білетамі.

Яна СВЕТАВА.

СМЕРЦЬ НА РЭЙКАХ

У Оршы пад коламі цягніка загінуў 17-гадовы навучэнец мясцовага механіка-тэхналагічнага каледжа.

Паводле звестак Беларускай транспартнай пракуратуры, трагедыя адбылася раніцай, прыкладна ў 9 гадзін 10 хвілін, паблізу чыгуначнай станцыі «Орша-Усходняя». Відавочцы жудаснага здарэння бачылі, як хлопец кінуўся пад колы цягніка «Крычаў — Орша». Аднак у пракуратуры падкрэслілі, што канчатковыя высновы наконт самагубства можна будзе рабіць толькі пасля завяршэння расследавання крымінальнай справы, якая ўзбуджана на падставе факта смерці юнака.

Мікола ДЗЯБЁЛА.

Гайненский сельский исполнительный комитет Логойского района (Продавец) проводит открытый аукцион по продаже 5 (пяти) земельных участков для индивидуального жилищного строительства:

Лот 1 — земельный участок № 1 в д. Гайна, площадь участка — 0,1945 га, кадастровый номер 623280801601000167, начальная цена — 4 862 500 белорусских рублей;

Лот 2 — земельный участок № 2 в д. Гайна, площадь участка — 0,2500 га, кадастровый номер 623280801601168, начальная цена — 6 250 000 белорусских рублей;

Лот 3 — земельный участок № б/н в д. Звериничи, площадь участка — 0,1952 га, кадастровый номер 623280803601000037, начальная цена — 4 880 000 белорусских рублей;

Лот 4 — земельный участок № б/н в д. Мурованка, площадь участка — 0,1161 га, кадастровый номер 623280808101000011, начальная цена — 1 741 500 белорусских рублей;

Лот 5 — земельный участок № б/н в д. Малые Укроповичи, площадь участка — 0,1489 га, кадастровый номер 623280807101000024, начальная цена — 2 233 500 белорусских рублей.

Целевое назначение земельных участков — строительство и обслуживание жилого дома.

Продажа земельных участков производится гражданам Республики Беларусь, постоянно проживающим на территории республики или приравненным к постоянно проживающим в соответствии с законодательными актами Республики Беларусь. Задаток в размере 10 % от начальной цены перечисляется на р/счет № 3600619020025 в ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Логойск, МФО 153001518, УНП 600181697. Оплата за объект аукциона должна быть осуществлена в течение 20 рабочих дней со дня получения протокола о результатах аукциона. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится 19.02.2008 г. в 11.00 по адресу: Логойский район, д. Гайна, ул. Советская, 14. Заявление на участие и необходимые документы принимаются до 15.02.2008 г. до 17.00 по адресу: Логойский район, д. Гайна, ул. Советская, д. 14.

Контактные телефоны: 8 (01774) 58 2 36, 56 4 98.

УНП 600181697.

ISSN 1990 - 763X

КУРСЫ ВАЛЮТ

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 18.01.2008 г. (для б/н разлікаў)

1 долар ЗША	2 150,00
1 еўра	3 142,44
1 латвійскі лат	4 499,79
1 літоўскі літ	910,19
1 чэшская крона	120,23
1 польскі злоты	874,37
1 расійскі рубель	87,74
1 украінская грыўня	424,40

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ

USD	24,5043
10 UAH	48,1657
1000 BYR	11,3650
EUR	35,8620

Курс у гандлёвых кампаніях (на 17.01.2008 г.)

USD	2135 / 2210

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2008 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009

ЗДАРОЎЕ І ШЧАСЦЕ Ў АСАБІСТЫМ ЖЫЦЦІ ЛІЧАЦЬ ПРЫЯРЫТЭТНЫМІ АМАЛЬ ПАЛАВІНА БЕЛАРУСАЎ

Аб гэтым сведчаць вынікі сацыялагічнага апытання, праведзенага аналітычным цэнтрам ЕсооМ.

У прыватнасці, 23,5 працэнта апытаных са спіса прапанаваных прыярытэтаў выбралі здароўе, а 22,8 працэнта — шчасце ў асабістым жыцці.

Каханне з'яўляецца прыярытэтам 12,8 працэнта апытаных, кар'ера — 11,5 працэнта, а грошы — 9,9 працэнта. У той жа час 8,7 працэнта ўдзельнікаў даследавання ў якасці жыццёвага прыярытэту выбралі самарэалізацыю, 6,6 працэнта — поспех, 3 працэнты — самаўдасканаленне і 1,3 працэнта рэспандэнтаў — славу.

Саюдаследаванне праведзена ў снежні 2007 — студзені 2008 года на тэрыторыі ўсёй краіны. Былі апытаны 1614 грамадзян ва ўзросце ад 16 гадоў да 31 года.

«УСЕ ПЕРАЎТВАРЭННІ — Ў ІНТАРЭСАХ ЧАЛАВЕКА»

(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар.)

Гэтая негатыўная тэндэнцыя акрэслілася на працягу апошніх гадоў. Таму падтрымка прысядзібных гаспадарак набывае асаблівую актуальнасць. Тут неабходна прымяняць новыя, больш эфектыўныя формы работы. Напрыклад, плануецца, што паміж прыватнымі падворкамі і сельгаспрадпрыемствамі будуць заключацца спецыяльныя двухбаковыя дамоўленасці, у адпаведнасці з якімі вяскоўцы павінны вырошчваць тую ці іншую прадукцыю і рэалізоўваць яе ў тыя ж СВК, а гаспадаркі пры неабходнасці ва ўсім ім дапамагаць. Напэўна, такое супрацоўніцтва дазволіць вырашыць многія надзённыя праблемы. З боку мясцовай улады павінна аказвацца ўсебаковая падтрымка прыватных падворкаў, каб у людзей не знікала жаданне працаваць на прысядзібным участку.

Шмат належыць зрабіць і ў межах рэалізацыі Комплекснай праграмы развіцця рэгіёнаў, малых і сярэдніх гарадоў. Як мы ведаем, галоўная мэта гэтай грунтоўнай сістэмы мерапрыемстваў — стварэнне ўмоў для прыярытэтнага развіцця тэрыторый, паляпшэнне работы аграпрамысловага комплексу. Шляхам стварэння новых прадпрыемстваў, размяшчэння філіялаў і цэхаў прадпрыемстваў, якія дзейнічаюць, а таксама пашырэнне сферы паслуг за кошт прадпрымальніцтва створана больш чым 700 працоўных месцаў. Зараз у Мінскай вобласці дзейнічае 38 рэгіянальных праграм развіцця малых і сярэдніх гарадоў, рэалізуецца 102 праекты на 484 мільярды рублёў. 46 з іх уключана ў адпаведную дзяржаўную праграму.

— Леанід Фёдаравіч, як развіваецца ў вёсцы прыватны сектар?

— Увогуле развіццю прадпрымальніцтва надаецца асаблівая ўвага. Такім чынам забяспечваецца занятасць насельніцтва, паляпшаецца дабрабыт. Малыя прадпрыемствы працуюць ва ўсіх галінах эканомікі цэнтральнага рэгіёна. Перш за ўсё яны займаюцца гандлем і грамадскім харчаваннем (больш чым трэцяя частка агульнай колькасці), прамысловай вытворчасцю (27,7 працэнта), будаўніцтвам (11,3 працэнта), а таксама сельскай гаспадаркай (10,1 працэнта). Рэалізуюцца рэгіянальныя праграмы падтрымкі малога прадпрымальніцтва. Дзяржаўная падтрымка ажыццяўляецца ў тых накірунках дзейнасці, што вызначаны як прыярытэтныя — вытворчасць, перапрацоўка сельскагаспадарчай прадукцыі, нарошчванне экспарту, гандаль і аказанне працмых паслуг насельніцтву. У першую чаргу сродкі, зразумела, выдзяляюцца на рэалізацыю перспектыўных інвестыцыйных праектаў, у тым ліку накіраваных на стварэнне новых працоўных месцаў.

Таксама вельмі актуальнае пытанне — у адпаведнасці са статыстычнымі данымі на пачатак гэтага года, узровень беспрацоўя ў вобласці склаў 0,9 працэнта да колькасці эканамічна актыўнага насельніцтва. Аднак рэальны паказчык вышэйшы, паколькі заўсёды варта мець на ўвазе наяўнасць схаванага беспрацоўя. Таму прымаюцца меры па забеспячэнні занятасці моладзі, а таксама па прыцягненні ў эканоміку людзей, якія доўгі час нідзе не працавалі. За мінулы год колькасць занятага насельніцтва ў рэгіёне павялічылася на 8,8 тысячы чалавек і ўвогуле склала амаль 640 тысяч. Летась у межах выканання Дзяржаўнай праграмы адраджэння і развіцця вёскі за кошт усіх крыніц фінансавання ў глыбінцы было створана амаль 7,5 тысячы працоўных месцаў. Так што для жыхароў вёскі апошнім часам з'яўляюцца новыя магчымасці не толькі для працаўладкавання, эфектыўнага вядзення прысядзібнай гаспадаркі, але і, так бы мовіць, больш глабальныя — напрыклад, для арганізацыі ўласнай справы.

«10,9 трлн рублёў на развіццё вёскі»

— Што ўдалося зрабіць у межах праграмы адраджэння вёскі?

— У межах рэалізацыі Дзяржаўнай праграмы адраджэння і развіцця вёскі на 2005—2010 гады за апошнія тры гады было выдаткавана больш чым 10,9 трлн рублёў: 8,7 трлн рублёў накіравана ў вытворчую сферу, 2,2 трлн — у сацыяльную. Зразумела, асноўны прыярытэт — развіццё вытворчасці, гэта вызначальны момант, аднак і развіццё сацыяльнай сферы не з'яўляецца нейкай «другаснай» задачай.

Плануецца, што да 2010 года ў Мінскай вобласці будзе 325 аграгарадкоў — паселішчаў новага тыпу з вытворчай і сацыяльнай інфраструктурай, што дазволіць наладзіць належнае абслугоўванне ўсёй бліжэйшай акругі. Стварыць спрыяльныя ўмовы для працы і для жыцця, адпаведныя для жыхароў сельскай мясцовасці і гараджан — менавіта на гэта і скіравана праграма адраджэння вёскі. Планы паспяхова ўвасабляюцца ў жыццё: на працягу 2005—2006 гадоў у рэгіёне з'явіліся 71 аграгарадок, а летась — 62. На іх абуладкаванне выдаткавана каля 400 мільярдаў рублёў. Гэтыя сродкі можна правамерна лічыць сапраўднымі інвестыцыямі ў будучыню.

У вёсцы заўважна актывізавалася будаўніцтва: толькі за мінулы год тут было здадзена ў эксплуатацыю больш чым 690 тысяч квадратных метраў жылля, што складае 83 працэнты ад агульнага паказчыка. Гэта з'явілася вызначальным фактарам для замацавання ў аграпрамысловым комплексе вобласці спецыялістаў і рабочых масавых прафесій, а таксама ўрачоў, настаўнікаў, работнікаў культуры. Увогуле будаўнічая галіна на Міншчыне развіваецца даволі дынамічна: за апошнія дзевяць гадоў у вобласці ўзведзена амаль 5,8 мільёна квадратных метраў жылля. Уяўляеце, тысячы жыхароў цэнтральнага рэгіёна вырашылі, бадай, адно з найбольш актуальных пытанняў — жыллёвае. А яшчэ колькі гадоў таму яны пра гэта нават і марыць не маглі. Што яшчэ раз пацвярджае: усе пераўтварэнні ў нашай дзяржаве адбываюцца ў інтарэсах чалавека.

У Маладзечне і Старых Дарогах уведзены ў эксплуатацыю новыя Дварцы культуры, у Заслаўі пачалі працаваць дзіцячая школа мастацтваў і бібліятэка, у вёсцы Занарач Мядзельскага раёна — дом вольнага часу, а ў вёсцы Вежы, што на Случчыне, — Дом культуры. Завершана рэканструкцыя краязнаўчага музея і маладзёжнага культурнага цэнтра ў Лагойску, дзіцячых школ мастацтваў у Радашковічах і Салігорску, шэрагу іншых сацыяльных аб'ектаў. Усяго за апошнія дзесяць гадоў на тэрыторыі Мінскай вобласці пабудавана 9 школ, 5 дзіцячых дашкольных і 17 бальнічных устаноў, 9 клубаў, 2 басейны і фізкультурна-аздараўленчы комплекс.

«Укладанні ў сацыяльную сферу заўсёды апраўданыя»

— Леанід Фёдаравіч, абласны бюджэт па-ранейшаму захоўвае сацыяльную накіраванасць?

— Неабходна забяспечыць максімальныя магчымасці для ўсебаковага гарманічнага развіцця чалавека. Таму, зразумела, захоўваецца сацыяльная накіраванасць бюджэту — апошнім часам адпаведныя выдаткі складаюць больш за 60 працэнтаў. За кошт росту даходаў прадпрыемстваў рэальнага сектара эканомікі, адкрыцця новых вытворчасцяў у малых гарадах і ў вёсках з'яўляецца магчымасць усё больш сродкаў накіроўваць на развіццё сацыяльнай сферы.

Гэтыя ўкладанні стабільна павялічваюцца: да прыкладу, летась у параўнанні з 1998 годам расходы на ахову здароўя ўзраслі больш чым у 2,1 раза. Нарматыў бюджэтнай забяспечанасці расходаў у разліку на аднаго жыхара вобласці ў мінулым годзе склаў 311,1 тысячы рублёў. Вялікую ўвагу надаём умацаванню матэрыяльна-тэхнічнай базы ўстаноў аховы здароўя. Летась на бягучы рамонт выдаткавана 11,6 мільярда рублёў, на капітальны рамонт — 22,8, а на набыццё сучаснага абсталявання (камп'ютарных і магнітнарэзанансных тамаграфаў, рэнтгенаўскіх апаратаў, ультрагукавых сканераў высокага і экспертнага класа, інкубатараў для немаўлят, стаматалагічных установак і г.д.) — 27,4 мільярда рублёў. За кошт сродкаў абласнога бюджэту было закуплена больш чым 200 санітарных аўтамабіляў. Умацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы ўстаноў аховы здароўя, укараненне сучасных тэхналогій дыягностыкі і лячэння будзе працягвацца і надалей. Мы плануем удасканальваць аказанне медыцынскай дапамогі як гараджанам, так і вяскоўцам. Улічваючы тое, што 2008 год абвешчаны Годам здароўя, мяркуецца сканцэнтраваць увагу не толькі на развіцці медыцынскіх устаноў, але і на прафілактыцы, папулярызацыі здарова лада жыцця. Чацвёрты год запар на Міншчыне адзначаецца рост нараджальнасці, а летась — змяншэнне смяротнасці. Аднак увогуле дэмаграфічная сітуацыя далёкая ад аптымістычнай, таму трэба яшчэ шмат працаваць над тым, каб палепшыць становішча.

На ўтрыманне ўстаноў адукацыі выдаткоўваецца амаль трэць абласнога бюджэту. Праводзіцца аснашчэнне ўстаноў адукацыі сучаснай камп'ютарнай тэхнікай і неабходным вучэбным абсталяваннем. На гэтыя патрэбы выдаткоўваюцца значныя сродкі. Напрыклад, на набыццё камп'ютараў у Мінскай вобласці (усяго іх было закуплена 3,6 тысячы) апошнім часам выдаткавана больш чым 10 мільярдаў рублёў. Павышэнню якасці адукацыі спрыяе дыферэнцыяцыя адукацыйнай сеткі. Паспяхова выступаюць навучэнцы Мінскага радыётэхнічнага каледжа, Мінскага радыётэхнічнага каледжа імя П.М.Мітраховіча, Мінскага прадметных алімпіядах — летась яны атрымалі 90 дыпломаў (пазалетась — 80). Найвышэйшы вынік падчас паступлення ў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (389 балаў) паказала выпускніца гімназіі Дзяржынска Кацярына Дулуб.

Як бачым, укладанні ў сацыяльную сферу заўсёды апраўданыя, паколькі дазваляюць ужо зараз фарміраваць будучыню, стварацьнадзённых праблем. Сёлета неабходна справіцца з шэрагам вельмі важных эканамічных і сацыяльных задач, паколькі 2008-ы — трэці год пяцігодкі, надзвычай адказны перыяд. У залежнасці ад таго, як цяпер спрацуем, залежыць рэалізацыя перспектыўных планаў, што былі зацверджаны на III Усебеларускім сходзе. Трэба заўсёды памятаць: агульны вынік залежыць ад кожнага з нас, толькі сумеснымі намаганнямі можна дасягнуць станоўчых змяненняў.

Шыра віншую ўсіх жыхароў Міншчыны з 70-гадовым юбілеем вобласці, вялікі дзякуй за вашу самаадданую працу на карысць роднай дзяржавы. Зычу вам, вашым родным і блізкім здароўя, шчасця, дабрабыту, усмешак, упэўнены, што нам па сілах зрабіць жыццё яшчэ лепшым!

Мікалай ЛІТВІНАЎ.

«Нармальнае жыццё!»

Забытыя словы. Некалі яны здаваліся надуманымі і пафаснымі, а сёння набылі сапраўднае гучанне. Ёсць праца з прыстойнай зарплатай, і людзі пачалі гэта цаніць.

У дзяржплемпрадпрыемстве «Чырвоная зорка» даводзілася бываць неаднаразова, і прыехаўшы ў чарговы раз, адзначыў, што за год тут адбыліся пэўныя зрухі. А гэта значыць, што гаспадарка жыве.

Уладзімір і Ала ТРАЦЯКОВЫ.

За апошнія два гады на племпрадпрыемстве пабудавалі па дзяржаўнай праграме 26 дамоў для сваіх работнікаў. Статак павялічыўся за 2007 год на 700 галоў, узводзяцца два новыя карпусы на ферме, у мінулым годзе купілі 100 пакрытых цялушак венгерскай пароды... І галоўнае, што ў людзей — стабільная зарплата. Дарэчы, на племпрадпрыемстве працуе 900 чалавек і ахвотнікаў уладкавацца ў «Чырвоную зорку» заўсёды хапала.

У кабінеце дырэктара племпрадпрыемства Мікалая Дылеўскага знаходзіўся і яго намеснік Герой Сацыялістычнай Працы Іосіф Плаўскі, які і прапанаваў наведаць ферму, дзе надоі набліжаюцца да 9 тысяч літраў ад каровы. І калі мы ўжо ехалі на ферму, Іосіф Іосіфавіч адзначыў, што надоі залежаць ад трох «К» — каровы, кармоў і кадраў. А калі сустрэўся з загадчыцай фермы Алай Трацяковай, вырашыў, што лепшай кандыдатуры для артыкула і шукаць не трэба, тым больш што намеснікам у Алы Мікалаеўны — яе муж Уладзімір. Вось такі сямейны падрад.

Пасля заканчэння сельгасакадэміі вучоных-заатэхнікаў накіравалі ў іншую вобласць, а на Міншчыне яны апынуліся пазней, калі жонка вырашыла вярнуцца бліжэй да бацькоў. Вось так сям'я Трацяковых аказалася пад Клецкам.

На працу іх узяў Іосіф Плаўскі і не памыліўся. Былы дырэктар і цяпер гаворыць пра гэтую сям'ю з цеплынёй. Сапраўдныя работнікі і моцная сям'я.

Падчас кароткай сустрэчы мне падалося, што нягледзячы на сваю мілавіднасць, загадчыца — жанчына з характарам, а інакш і быць не можа. Кіраваць калектывам, у якім каля паўсотні чалавек, нялёгка.

— Усякае бывае, — кажа Ала Мікалаеўна, — але найлепшы рэгулятар дысцыпліны — гэта рубель. Калі нехта аступіўся, то дабаўкі да зарплаты не атрымае і людзі стараюцца не парушаць распарадак.

Калі Трацяковы прыйшлі на ферму, то надоі там былі 6,5 тыс. літраў ад каровы, а за час іх работы выраслі больш чым на дзве тысячы.

Што такое работа на ферме? Карова не станок, які можна адключыць. Людзі прыходзяць на працу ў 4 гадзіны і знаходзяцца на ферме да 12 гадзін, а затым да работы прыступае другая змена. Жывёла павінна быць накормленая, падоеная і дагледжаная. Ніякія збоі тут не прадугледжаны.

Падчас нашай размовы прыйшоў і намеснік — настала змена Уладзіміра Мікалаевіча, а ён аказаўся больш гаваркім, і натуральным было пытанне:

— Цяжка быць падначаленым у жонкі?

— Чаго цяжка, мне здаецца, што мы дапаўняем адно аднаго, — адказаў У. Трацякоў.

— А што, не было ніводнага праколу, каб жонка, як начальніца, не паставіла на від, не дала наганяй?

— Скажу, што пры людзях нечага падобнага ні разу не было, а вось, калі заставаліся сам-насам, то здаралася і выслухаць...

Нечаканасцю было тое, што ў Трацяковых ужо дарослыя дзеці — абое студэнты. А сёння вучыць іх няпроста. І мне падумалася, што сям'я трымае моцную гаспадарку, бо трэба ж, каб дзеці былі апранутыя не горш за іншых, мелі мабільнікі... А аказалася, што Трацяковы маюць жыллё ў чатырохкватэрным доме і каровы ў іх няма. Але гэта як і ў іншых, бо на цэнтральнай сядзібе свая карова ўжо рэдкасць — малако можна купіць у крамах гаспадаркі. Даводзіцца жыць на зарплату і хацелася б, каб яна была па мільёну ці болей, але Трацяковы не скардзіліся на жыццё. Сын ужо на пятым курсе, а там і дачка неўзабаве закончыць. Праўда, дзеці не пайшлі сцяжынай бацькоў, а выбралі іншыя прафесіі.

— А ў нас усё добра — жывём працай. Дачка іншым разам нават злуецца: «А што, вам няма пра што пагаварыць — дзень і ноч усё толькі пра работу», — расказвае Уладзімір Мікалаевіч.

Калі шчыра, то падумалася: «Вось людзі закончылі акадэмію, а сядзяць на ферме і няхай не раздаюць сілас і не выграбаюць гной, але ж гэта не вяршыня для спецыялістаў, тым больш што іншымі фермамі кіруюць людзі ўвогуле без адукацыі». Вось пра гэта я спытаў у загадчыцы фермы.

— Нехта з тых, з кім я вучылася, займае высокую пасаду, а нехта падаўся ў бізнэс, ёсць, напэўна, і тыя, у каго жыццё не склалася — пра многіх нічога не ведаю. Асабіста я сваім лёсам задаволеная, бо калі мы гаворым пра ферму, то тут абавязкова трэба адзначыць, **якая** ферма. Відавочна, можна было б і на вопыце сваёй працы напісаць навуковую работу, але ў мяне тэорыя і практыка даўно ўжо адно цэлае — задумы адразу ж і рэалізуюцца. Важна, каб работа не была цяжарам, — адказала Ала Мікалаеўна.

— Нармальнае ў нас жыццё і лёс нармальны, — падтрымаў загадчыцу муж.

А затым, калі мы вярталіся з фермы, Іосіф Плаўскі сказаў: «Каб яна захацела, то і дысертацыю напісала б, і абаранілася б. Такіх людзей трэба цаніць».

Але элітная ферма трымаецца і на тых людзях, якія жывёлу дояць і даглядаюць. Была перазменка і не ўдалося сустрэцца з даяркай Нінай Шпак, якая надаіла ў сярэднім 8886 кг малака ад каровы, а вось Людміла Высоцкая (8862 кг) адказала коратка: «А што тут гаварыць, раблю, каб было не горш, як у другіх».

Двойчы зазіраў у корпус, дзе стаялі каровы Высоцкай, і бачыў, як жанчына ўвесь час хадзіла каля сваіх кароў і ўсё чысціла...

І не толькі Людміла Высоцкая такая працавітая. Напрыклад, Міхаіл Дамарацкі са сваіх 50 гадоў 30 адпрацаваў жывёлаводам. Мне сказалі, што менавіта тыя каровы, якіх даглядае ён, даюць самыя высокія надоі.

— Калі высокія надоі, то кожны працэнт росту даецца цяжка, але ў нас яны павінны быць высокімі з той прычыны, што мы пастаўляем племянных бычкоў, а іх маці абавязаныя быць высокапрадукцыйнымі каровамі, — растлумачыў Мікалай Дылеўскі. — Магчыма, самымі рэнтабельнымі для гаспадаркі былі б надоі па пяць тысяч, але мы павінны вырошчваць карою-рэкардсменак. Калі бычок ад такой каровы, то да яго і цікавасць большая. Між іншым, летась гаспадарка прадала больш за 100 племянных бычкоў.

І хоць да «Чырвонай зоркі» далучылі яшчэ дзве гаспадаркі і з гэтай прычыны паказчыкі па дзяржплемпрадпрыемству крыху знізіліся, але гэтая з'ява часовая.

З нагоды 70-годдзя Міншчыны ў Клецку 12 студзеня праводзіліся раённыя ўрачыстасці, на якіх прысутнічалі і працаўнікі з «Чырвонай зоркі». Яны заслужылі добрых слоў і ўшанавання. А каравай, які яны прывезлі з сабой у райцэнтр, быў, бадай, самым прыгожым і важкім.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Клецкі раён.

Міхаіл ДАМАРАЦКІ і Людміла ВЫСОЦКАЯ.

ГЕРОІ РАЁНА — ГЕРОІ КРАІНЫ

Удзельніца Вялікай Айчыннай вайны, ганаровы жыхар Маладзечна Клара ФІЛІПАВА і Герой Сацыялістычнай Працы Фёдар КОМАР.

Ветэраны, асобы, якія аддалі сябе служэнню мастацтву, развіццю прадпрыемстваў, жыццё сваё прысвяцілі выратаванню і ахове жыцця іншых, гэтым днямі ўшаноўваюцца на Міншчыне. У юбілейныя дні цэнтральная вобласць збірае ўсіх, каму абавязана сваімі дасягненнямі і поспехамі.

Урачыстыя мерапрыемствы прайшлі ва ўсіх раёнах. Карэспандэнт «Звязды» наведаў адзін з самых буйных, Маладзечанскі. Па эканамічным развіцці ён не саступае першых пазіцый.

— За апошні час раён значна змяніўся да лепшага ў сацыяльнай, бытавой, вытворчай сферах. Тут працуюць таленавітыя людзі, якія выконваюць сваю работу выдатна. У яго вялікі, невычарпальны патэнцыял. Сёння ўсе мы разумеем, што без прыцягнення ўнутраных і знешніх інвестыцый развіцця не будзе. Трэба ўкладваць сродкі і ў новыя тэхналогіі, — дзеліцца думкамі старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па жыллёвай палітыцы, будаўніцтве, гандлі і прыватызацыі Мікалай Чурсін. — Мінская вобласць зараз займае вядучае месца ў краіне. Амаль палова ўсяго, што ствараецца ў Беларусі, робіцца рукамі адказных, паважаючых свой край людзей, якія жывуць у цэнтральнай вобласці. Ганарыцца і ведаць аб гэтым трэба кожнаму.

Без працавітых рук і стваральнага розуму чалавека немагчыма было б выканаць ніводную задуму. Таму людзі, якія зрабілі Маладзечна адным з самых моцных, развітых цэнтраў краіны, заўсёды застануцца галоўнымі яе героямі. Старшыня раённага выканаўчага камітэта Сямён Касабуцкі ганарыцца жыхарамі гэтай зямлі:

— Мы выказваем самую глыбокую павагу і словы падзякі тым, хто працаваў тут у розныя часы, ва ўсе гады існавання Міншчыны. Увесь гэты час раён наш быў і застаецца адным з найбольш сацыяльна ўладкаваных, і мы працягваем мацаваць дабрабыт людзей. Як і заўсёды, працуем напружана, каб дасягнуць усіх мэтаў і спраўдзіць чаканні.

Хто ж яны, людзі, якія прыклалі ўсе сілы на карысць свайго краю, Маладзечна? Яны вельмі розныя. Настаўнікі, урачы, спецыялісты сферы вытворчасці, дзеячы культуры і навукі, супрацоўнікі праваахоўных органаў... Розныя па ўзросце, занятках, пасадах, але ўсе святкуюць юбілей вобласці як уласны. Тым больш што ёсць сярод іх і аднагодкі рэгіёна, і старэйшыя за яго. Але, нягледзячы на ўзрост, для вобласці зусім невялікі, а для яе людзей — даволі паважны, усе поглады скіраваныя толькі ў будучае.

Дзмітрый АЛЬФЕР.

СЭРЦА КРАІНЫ —

Па любові!

(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар.)

Безумоўна, нюансаў можа быць шмат. Напрыклад, тая ж сустрэча. Гэта можа быць самым складаным. Ніхто ніколі не ведае, што з'явіцца для двух незнаёмых яшчэ людзей сігналам: стоп! гэта тое, што трэба! У выпадку з Тарбенкамі такім сігналам стаў... дзявочы фотаальбом. Увогуле, лёсавызначальнай сустрэчы лягчэй адбыцца, калі ў дзяўчыны ёсць пяць братоў. Як у Валянціны. Тады больш верагоднасці, што да аднаго з іх прыедзе ў госці будучы бацька тваіх дзяцей. Генадзь Тарбенка спачатку пазнаёміўся з бацькамі Валі, завітаўшы ў 1991 годзе да свайго аднакурсніка і сябра Аляксандра Падлужнага, а потым ужо — з ёй самой. Яму, каб нечым заняць, далі ў рукі студэнцкі фотаальбом старэйшай з сясцёр. Генадзь стаў яго гартаць і раптам рассмяяўся: на пергаментнай паперы, якой перакладзены старонкі з фатаграфіямі, дзявочай рукой былі намаляваныя закаханыя парачкі, і амаль усюды мужчына на тых малюнках — з барадой. «Я тады падумаў: гэта лёс!» — смяецца барадаты бацька вялікага сямейства.

У яго не было нічога, акрамя гучнай пасады «намесніка дырэктара металабазы», упэўненасці ў сваіх сілах і вялікай унутранай энергіі. Таму ён служаўся, калі ледзь не ў першую сустрэчу спытаў Валянціну: «Паедзеш са мной?» і тая адказала: «Так». Не згоды яе служаўся, а выкрыцця падману. Гэта ён лічыць падманам уражанне, якое аказаў на сям'ю Падлужных. Валянціна ўзгадвае дом без вокнаў і дзвярэй у пасёлку на Міншчыне, куды ён яе прывёз, цалкам спакойна. Да зімы яны склалі печ ды прыстасавалі для жылля адзін пакойчык. Астатнюю частку дома закалацілі дошкамі да лепшых часоў.

Валянціну Генадзь узяў не адну, а з дзіцем — трохгадовай Марынай. Праз два гады ў іх нарадзілася другая дзяўчынка, гэтакая ж светлавалосая, як маці. Генадзь прыйшоў з пяцігадовай Марынай пад вокны радзільні і крычыць жонцы: «Марына навучылася вымаўляць гук «ш», таму дачку мы назавём Даш-ша!».

Сёння моладзь больш абачлівая. Асабліва што датычыцца афіцыйна аформленых зносінаў. Таму і шлюбы, і нараджэнне першых дзяцей адсоўваюцца на больш позні ўзрост. Калі ўжо нешта маецца — жыллё, дастатковы даход... А тады, у 1991-м, калі на паліцах у крамах было гола, грошы нічога не важылі і ўвогуле навокал больш рушылася, чым стваралася, Валянціна не проста асмелілася даверыцца Генадзю, яна без усялякіх бачных звычайнаму чалавеку падстаў здолела разгледзець у ім галоўнае — надзейнасць. Таму, як бы ні складалася ў іх жыццё, з якімі цяжкасцямі яны ні сутыкаліся б, а гэта непазбежна ў любой сям'і, яна ніколі ні на імгненне не адчувала сябе падманутай. Яна з першай хвіліны адчула, што гэты чалавек зробіць усё што зможа. І зможа ўсё, што пажадае. Дзеля тых, каго любіць.

Не ведаю, ці сумнявалася калі-небудзь Валянціна ў каханні Генадзя. Занадта асабістае пытанне для журналіста. Ды і ці важна: былі хвіліны сумненняў альбо не. Важна тое, што гэтыя двое людзей маюць на сёння не толькі 9 дзяцей (хай старэйшае ўжо і аддзялілася, але ўсё роўна дзіця для іх абодвух), але і згоду, і лад у сям'і. Больш за тое! Яны пазіраюць адно на аднаго так, нібы ўсё толькі пачынаецца... Вось прыклад. Ён першы ўзгадвае і просіць Валянціну дастаць рэчы, якія яна сама звязала, сапраўды шыкоўныя, дадае, што вяжа яна хутка — жаночую кофту з вышыўкай за два тыдні. І раптам дадае: «Валя, пакажы тую, маю любімую, з ружамі!» І я бачу, што яна дастае гэту рэч не для нас, і не для сябе, а для Яго. І мне становіцца відавочным: ён ганарыцца сваёй жанчынай і захаваны ў яе як юнак.

Валянціна не памылілася. У Генадзя аказаліся залатымі рукі. Ён сам давёў да ладу дом, зрабіў у ім выгоды, пабудаваў лазню... Экаламіст па адукацыі, ён яшчэ і таленавіты будаўнік, агранom, жывёлавод, мастак, музыка і цудоўны бацька. Генадзь з тых людзей, якія не баяцца ніякай работы. Кажа: нездарма ў мяне прозвішча ўтворана ад беларускага слова «торба» — усё ў дом! Шмат гадоў яны трымалі карову і каня, спрабавалі разводзіць пчол і авечак. Нешта атрымлівалася, нешта — не. Але яны ніколі не гублялі добрага запалу ў сваім сямейным жыцці. Напэўна, таму цалкам натуральным было з'яўленне трэцяга дзіцяці. Таксама дзяўчынкі.

— Тата паглядзеў на яе і сказаў: «Баба Аня!». Так, у гонар бабулі, Ганнай і назвалі, — тлумачыць Валянціна.

Потым ім нехта сказаў, што, каб хлопчык нарадзіўся, трэба адной з дачок даць імя маці. Яны так і зрабілі... наступным разам. Не тое што дакладна вырашылі не спыняць спробаў, а так, на ўсялякі выпадак. Праз два гады Валянціны-старэйшую давялося везці ў паліклініку: забалеў жывот. Яна яшчэ карміла грудным малаком маленькую Валечку і наступнае дзіця не толькі не планавала, але была ўпэўненая, што грудное кармленне таму перашкода. Не на жарт, і зусім не таго, спужаўся Генадзь, калі ўрач, пасля агляду жонкі, запрасіла яго ў кабінет. Яна падвяла яго да манітора апарата ўльтрагукавага даследавання і паказала на нейкую пляму. Ад трывогі і страху Генадзь нічога не мог разабраць, думкі лезлі ў галаву адна жахлівей за другую. Ён глядзеў то на манітор, то на жонку, то на ўрача і чакаў усяго. Акрамя таго, што пачуў.

— Бачыце — гэта ручка, яно вітае вас! — ласкава прамовіла ўрач.

— Хто?! — сеўшым голасам спытаў галава шматдзетнай сям'і.

— Дзіця, хто ж яшчэ, — усміхнулася доктарка.

— Дзіця? — не паверыў бацька. І, зірнуўшы на жонку, з раптоўнай надзеяй спытаў: — Дык можа хлопчык?!

Не, адказалі яму, сумненняў няма: дзяўчынка. Ляжыць і махае ручкай. І ён не ведаў, плакаць яму ці смяяцца. Так у сям'і Тарбенкаў амаль пяць гадоў таму з'явілася Танюшка — якраз на Дзень студэнтаў. Пятая дачка. Першая яе фатаграфія, з «ручкай», займае пачэснае месца ў сямейным архіве.

У 2005-м іх запрасілі ў аблвыканкам для ўзнагароджвання Валянціны Ордэнам Маці. Ордэн уручаў Леанід Крупец, тады яшчэ намеснік губернатара вобласці. А за сталом падчас урачыстасці побач з Тарбенкай сядзела жанчына, якая прадстаўляла нейкі фонд дапамогі дзецям-сіротам. Яна спачувальна прамовіла: «Не атрымліваецца ў вас хлопчык? Дык можа з дзетдома ўзялі б? Ёсць у мяне адзін на прыкмеце...»

Па шчырасці, размовы ў іх пра гэта былі даўно. Тая жанчына толькі падштурхнула Тарбенкаў прыняць канчатковае рашэнне. Словы яе былі сказаны ў свой час і ў невыпадковым месцы. Яны, да таго ж, цьмяна сабе ўяўлялі працэс выбару дзіцяці. А тут было названа канкрэтнае імя. Забралі, праўда, іншае. Так, кажуць, часта бывае. Людзі прыходзяць за адным, а забіраюць іншае. Ніхто — ні супрацоўнікі дзіцячых дамоў, ні псіхолагі, ні самі бацькі не могуць патлумачыць, чаму так адбываецца. Напэўна, тут уступаюць у сілу не тутэйшыя, не зямныя законы жыцця. Шасцігадовы Сашка не проста раз і назаўсёды ўчапіўся ў іх. Ён гучна і без права на сумненне заявіў усім астатнім дзецям: «Гэта МАЁ бацькі! Уцямілі?! А цяпер адыдзіце ад іх!»

У той момант Сашка яшчэ не ведаў, што дома яго чакаюць пяцёра сястрычак. Неяк у першыя дні ён сказаў бацьку: «Навошта вам столькі дзяцей? Здайце іх у дзетдом і пакіньце толькі мяне. Я буду добрым сынам».

Яны таксама не адразу даведаліся, што ў Сашы ёсць малодшы брат Стасік і старэйшы Сяржа, а яшчэ сястра Маргарыта. Усе — у розных інтэрнатах і дзіцячых дамах. Праз два гады, калі Саша стаў ужо зусім іншым дзіцем, больш адкрытым, добразычлівым і даверлівым, калі ён цалкам упісаўся не толькі ў іх сям'ю, але і ў школьны клас, і ў кола вясковых дзяцей, яны вырашылі забраць астатніх. І нечакана сутыкнуліся з перашкодай.

Аказалася, што для статуса прыёмных бацькоў у іх зашмат сваіх уласных дзяцей. Як правіла, прыёмная сям'я выхоўвае чатырох, гэта разам з роднымі. Чыноўнікі пагаджаліся: так, справа добрая, уз'яднанне сям'і. Але ніхто не вырашаўся ўзяць на сябе адказнасць. Тады Тарбенкі пайшлі на прыём да міністра адукацыі. І хоць міністр ніякіх абяцанняў не даў, братоў і сястру свайго ўжо Сашы яны прывезлі дамоў мінулай вясной.

Перажыць давялося шмат. Да многага яны былі падрыхтаваныя вопытам вяртання да нармальнага жыцця Сашы. Але пра некаторыя выпрабаванні і здагадацца не маглі. Напрыклад, Рыта пасля летняй паездкі на аздараўленне ў Італію, вырашыла, што італьянская сям'я яе і Сяржу ўсынавіла б, калі б Тарбенкі іх не забралі. Рыце патлумачылі, што гэта немагчыма не таму, што яе забралі ў прыёмную сям'ю, а таму, што ў яе ёсць яшчэ два браты. Закон забараняе раз'яднанне сям'і (тое, што да вясны 2007 года сям'я была фактычна раз'ядналая — іншая размова). Пад пытаннем была і сур'ёзнасць намераў італьянцаў, калі яны, не першы год прымаючы на канікулы дзяцей, сваё жаданне ўсынавіць іх дагэтуль афіцыйна не выказавалі. Спатрэбілася шмат часу, цярпення і мудрасці з боку Валянціны і Генадзя, каб аднавіць у доме даверлівую, утульную, цёплую і, уласцівую Тарбенкам, творчую атмасферу. І калі на Каляды італьянцы зноў запрасілі Рыту і Сяргея, яны, параіўшыся з псіхолагам, адпусцілі дзяцей. Чакаюць іх вяртання на Танюшын дзень нараджэння — 20 студзеня. А псіхолаг, дарэчы, пагутарыўшы адзін на адзін з дзецьмі, выклікала Тарбенкаў і з захапленнем усклікнула: «Што вы з імі зрабілі?! Яны ж сталі зусім іншымі!»

Сёння Валянціна і Генадзь працуюць прыёмнымі бацькамі. Кожны на стаўку. У яе — адзін Саша. У яго — Стас, Сяржа і Маргарыта. Улічваючы складанасці з працаўладкаваннем у вёсцы, гэта работа іх задавальняе. І дом пад наглядам, і з дзецьмі ёсць магчымасць займацца. Займацца даводзіцца шмат: проста размаўляць, тлумачыць нейкія ісціны, што адзін аднаго трэба паважаць, абараняць, трымацца, што рэчы трэба берагчы, што трэба быць акуратным, умець самому нешта рабіць, і не пакідаць справу недаробленай... З вучобай шмат сядзець даводзіцца. Валянціна па адукацыі педагог, настаўнік фізікі і матэматыкі. Гэта ёй вельмі дапамагае ў рабоце з дзецьмі. Добра, што і не адна яна завіхаецца з імі. Прыйшоў бацька, калі ўзнікае неабходнасць, можа дадаткова падзарабіць. Таму ў доме ў іх ёсць усё неабходнае: і добры тэлевізар, і камп'ютар, і лічбавы фотаапарат, і фартэпіяна (чацвёра дзяцей вучацца ў музычнай школе!)...

— Мне ніколі ніхто з дзяцей не сказаў: «Мама, а вось у некага ёсць тое, чаго няма ў мяне», і я вельмі рада гэтаму, — дзеліцца Валянціна. — Справа не ў тым, што дзеці нашы маюць усё. Справа ў тым, што яны, па-першае, нікому не зайздросцяць, па-другое, ведаюць цану грашам і рэчам. Перш чым пра нешта папрасіць, яны заўсёды спытаюць, ці ёсць на гэта сродкі. І калі няма, яны рэагуюць спакойна, з разуменнем. Ну а мы бяром на заметку, пра што дзіця марыць. І калі з'яўляецца магчымасць, купляем.

Марына, старэйшая, гэтай восенню выйшла замуж, з'ехала да мужа ў Мінск. І цяпер у Тарбенкаў усяго толькі... 8 непаўналетніх дзяцей. Чацвёра родных, чацвёра прыёмных, усе — свае. Месца ў доме хапае, у кожнага ёсць свой куток. Дзяржава забяспечыць жыллём прыёмных. Генадзь збірае для гэтага ўсе неабходныя паперы. Пра родных яны павінны клапаціцца самі. Тры гады таму яны былі ўключаны ў спісы шматдзетных сем'яў, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. Спадз

Пётр ХРЫПАЧ у сваім садзе.

МАЛІНАВЫ КАРОЛЬ

Як слабадскія гаспадары адраджаюць прэстыж сялянскай працы

Раз і назаўсёды «махнуць» тлумны, шумлівы горад на вясковую цішыню, прызнаемся, далёка не кожны зможа. Між тым, у такой «ракіроўцы» шмат станоўчых момантаў — прынамсі, гэта на сваім прыкладзе імкнуцца даказаць многія гаспадары, што распачалі ўласную справу на зямлі. Перавагі і цяжкасці такога ладу жыцця я адчуў у прысталічнай Слабадзе, куды завітаў у госці да даволі вядомага сярод вясковых прыватнікаў чалавека.

У Мінскім раёне, напэўну, самая вялікая колькасць фермерскіх гаспадарак сярод усіх рэгіёнаў краіны. Пётр Хрыпач зарэгістраваўся восенню 1997 года — атрымліваецца, што некалькі месяцаў таму адзначыў своеасаблівы юбілей.

Сялянская гаспадарка мае вельмі рамантычную, на мой погляд, назву — «Ясная зара». Аказваецца, што ў такой «шыльды» ёсць свая амаль 40-гадовая (!) гісторыя. Справа ў тым, што ў пачатку 1970-га Пётр Іванавіч узначаліў саўгас «Зара». Гэтую гаспадарку спецыяльна стварылі для забеспячэння прадуктамі харчавання жыхароў горада Новалукомля, дзе пачала ўзводзіцца вядомая ГРЭС. Падымаць новую справу даручылі Хрыпачу, якому ў той час было 25 гадоў. Тады ён быў самым маладым кіраўніком у Віцебскай вобласці!

Пасля школы скончыў у Аршанскім раёне Смальянскі сельскагаспадарчы тэхнікум па спецыяльнасці «агранамія», працаваў у Браслаўскім раёне. З усіх братоў і сёстраў (усяго ў яго сям'і выхоўвалася шасцёра дзяцей) «аграрная» адукацыя была толькі ў Пятра Іванавіча. Таму бацькі клікалі малодшага сына да сябе, у Чашніцкі раён. Дарэчы, ён і прыязджаў шукаць тут сабе месца, але так ужо склаліся абставіны, што накіраваліі ў Новалукомль — спачатку галоўным аграномам у калгас «Камунар», а пасля старшынёй у «Зару». Завочна адвучыўся ў Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі, у 1974-м паступіў на вочную форму ў аспірантуру пры навукова-даследчым інстытуце бульбаводства і плодаагароднінаводства. З таго часу і апынуўся ў Мінскім раёне.

— Над назвай сваёй сялянскай гаспадаркі доўга думаць не выпадала, — тлумачыць Хрыпач. — Гэта такі гістарычны працяг, праўда, у іншай форме ўласнасці. Дарэчы, праз некалькі гадоў, падчас перарэгістрацыі, давялося ўнесці пэўныя карэктывы. Паводле заканадаўства, аднолькавых назваў быць не павінна, а калі ў аблвыканкаме ў камп'ютары ўвялі «Зара», то высветлілася, што існавала 78 самых розных арганізацый з такой «шыльдай». Выйшаў у разгубленасці на вуліцу і думаю: «А навошта мне яшчэ і заўтра прыязджаць». Тут жа прыдумаў «свежую» назву — так і пайшла «Ясная зара».

Такім чынам, восенню 1997 года Пётр Хрыпач атрымаў свой першы «кавалак» зямлі — яму выдзелілі 8 гектараў. Як узгадвае, дагэтуль тут была паша, дзе на працягу некалькіх сезонаў пасвілі жывёлу і нічым не засявалі. Тэрыторыя размяшчалася за чатыры кіламетры ад дому — гэтую адлегласць Пётр Іванавіч дакладна «вымераў», у тым ліку і нагамі, паколькі неаднойчы даводзілася сюды дабірацца пешшу.

— Быў тады ў мяне «масквічок», рыдлёўкі і матыкі ў багажнік закіну — і сюды, а нярэдка здаралася, што напрасткі без аўто шыбаваў, — з усмешкай узгадвае Хрыпач. — Адразу займаўся толькі вырошчваннем агародніны, ні аб якім садзе нават гаворка не ішла, паколькі першапачаткоўга капіталу ўвогуле не было, апрацоўваў палеткі самастойна, па большасці ўручную. Крэдыту не атрымаў, таму даводзілася разлічваць на ўласныя сілы. Толькі налета з фонду падтрымкі фермерскіх гаспадарак выдзелілі невялікую суму, на гэтыя грошы ў Стаўбцоўскім раёне набыў саджанцы і пасадзіў гектар маліны, а таксама 40 сотак чорных парэчак.

Амаль чвэрць стагоддзя ён працаваў у садаводчай галіне — і ў навуцы (Хрыпач кандыдат навук), і на вытворчасці. Спецыялізацыю для ўласнай сялянскай гаспадаркі абраў свядома, паколькі апраўдана лічыць: кожны павінен займацца толькі тым, што ўмее рабіць і ведае, як лепш арганізаваць справу.

Займацца выключна садаводствам яшчэ і цяпер няма магчымасці, пэўная тэрыторыя адводзіцца пад агародніну: у гэтым сезоне плануе пасадзіць 2 гектары бульбы і гектар капусты, бураковіцы і моркву. Магчыма, ужо налета ўся зямля будзе занятая пад садам і ягаднікамі. Цяпер Хрыпач апрацоўвае больш чым трыццаць гектараў палеткаў — менавіта на такую тэрыторыю ён першапачаткова складаў свой план, але атрымаў далёка не адразу.

Цяпер сялянская гаспадарка «Ясная зара» — адзін з прызнаных лідараў у садаводстве. Ведаеце, яшчэ не даводзілася бачыць такіх вялікіх плошчаў пад яблынямі, грушамі, маліной, парэчкамі ды іншымі культурамі. Асабліва незвычайна гэта выглядае ўзімку, калі з пагорка бачна ўсё наваколле. Пётр Іванавіч ахвотна правёў цікавую «экскурсію» па сваіх палетках. Зараз ён апрацоўвае 12 гектараў сада і 15 — ягаднікаў. Астатнія плошчы занятыя пад гадавальнікамі, дзе вырошчваюцца саджанцы.

Штогод прапануюць 5—10 тысяч саджанцаў пладовых культур, а па большасці ўсё ж спецыялізуюцца на ягодніках. Той самы гектар маліннику, які быў закладзены амаль дзесяць гадоў таму, цяпер павялічаны да 12 гектараў. Смачнай ягады вырошчваюць 17 гатункаў, прычым сезон працягваецца да самых маразоў. У гаспадарцы ці не самыя буйныя па плошчы таварныя насадкі маліны ў Беларусі, нездарма ў асацыяцыі «Белсадгадавальнік» жартам і ўсур'ёз яго называюць «маліновым каралём».

Маліны збіраюць каля 10 тон, а яблыкаў — удвая менш. Справа ў тым, што сады толькі-толькі ўступаюць у «актыўную фазу», таму вялікія ўраджаі яшчэ наперадзе. Ёсць летнія, асенніе і зімовыя гатункі — у гаспадарцы вырошчваецца разнастайная «калекцыя». Таму з яблыкамі ў любы сезон ніякіх праблем не ўзнікае, адзінае, што стрымлівае далейшае пашырэнне плошчаў і, адпаведна, аб'ёмаў вытворчасці — адсутнасць добрых памяшканняў, дзе б можна было без усялякіх праблем захоўваць ураджай. Тым больш, як прагназуе кіраўнік сялянскай гаспадаркі, ужо ў бліжэйшыя гады валавая вытворчасць «смачнай» прадукцыі рэальна дасягне 300 тон.

Зразумела, што з такімі аб'ёмамі не справіцца ў адзіночку. Падчас сезона Хрыпач прыцягвае на дапамогу па 50—70 чалавек.

Бацьку ва ўсім дапамагаюць два сыны — Васіль і Барыс. Такім чынам, у пэўнай ступені можна лічыць, што вялікі сад аб'ядноўвае тры сям'і. Раней, узгадвае Хрыпач, сынам даводзілася шукаць дадатковую работу, паколькі «пракарміцца» з сялянскай гаспадаркі ўсім не выпадала. Цяпер сітуацыя змянілася — даходы паступова павялічваюцца, таму і працоўнае месца знойдзецца, у тым ліку і ўнукам Арцёму і Ганне, якія ахвотна завіхаюцца па гаспадарцы. І грошы зарабляюць. Як калісьці іх дзядуля, у Толпінскай сямігодцы, дзе меўся пладовы гадавальнік. Дарэчы, за дасягненні ў «садовай» справе ў 1957 годзе Хрыпач удзельнічаў на ўсесаюзнай сельскагаспадарчай выставе, дзе атрымаў малы залаты медаль. З таго часу, мабыць, і марыў стаць сапраўдным садаводам. І стаў.

— Яшчэ ў даваенны час Беларусь вывозіла антонаўку за мяжу, гандлявала гэтымі яблыкамі з многімі краінамі свету, — кажа Пётр Іванавіч. — Дык чаму ж цяпер не адрадзіць былую славу? Кліматычныя ўмовы ў нас спрыяльныя не толькі для вырошчвання яблыкаў, груш, сліў, але і большасці ягадных культур, у тым ліку і рэдкіх гатункаў. Сялянскія гаспадаркі тут павінны актыўна падключыцца, заняць вартае месца.

Мікалай ЛІТВІНАЎ,
Мінскі раён.

МІНСКАЯ АБЛАСНАЯ КЛІНІЧНАЯ БАЛЬНІЦА: БОЛЬШ ПАЦЫЕНТАЎ — БОЛЬШ АБНАЎЛЕННЯЎ

У Мінскай абласной клінічнай бальніцы — бадай, адзін з самых сціплых кансультацыйна-паліклінічных карпусоў у вобласці. А наведвальнікаў год ад году толькі прырастае: ужо цяпер паліклініка прымае каля 700 чалавек у змену, хоць разлічана яна максімум на 500. Падобная актыўнасць з боку хворых абумоўлена не толькі наяўнасцю высокакваліфікаваных спецыялістаў і добрай дыягнастычнай базай, але і некаторымі аб'ектыўнымі прычынамі: па-першае, Мінская вобласць — самая багатая на вясковае насельніцтва і, адпаведна, па-другое, — з кожным годам павялічваецца колькасць старых людзей, што з'яўляецца ўжо агульнарэспубліканскай тэндэнцыяй.

Фота Антона КЛЕЩЧУКА.

Варта нагадаць, што сама 35-гадовая бальніца — таксама ўжо немаладая (па мерках будынкаў). Таму заслужыла грунтоўнае абнаўленне. Што датычыцца непасрэдна паліклінічнага корпуса, то на змену сціпламу старому ў 2009—2010 гадах прыйдзе «нясціплы» новы. Пакуль можна сказаць, што ў асобна ўзведзеным будынку размесціцца не толькі паліклініка, але і два цэнтры абласнога прызначэння — кардыялагічны і эндакрыналагічны.

Паводле слоў **намесніка галоўнага ўрача па хірургічнай дапамозе Мінскай абласной клінічнай бальніцы Яраслава ПЕРАЛЫГІНА**, установа знаходзіцца цяпер на стадыі працяжу капітальнага рамонту і мадэрнізацыі. У апошнія гады аб'ёмы такіх работ растуць, колькасць вылучаных на іх грашовых сродкаў павялічваецца. Толькі ў апошнія тры гады былі мадэрнізаваныя чатыры аперацыйныя блокі, так што цяпер 15 аперацыйных залаў адпавядаюць еўрапейскім стандартам. Аперацыйныя залы атрымалі лепшыя ўзоры анестэзіялагічнага, стэрылізацыйнага і хірургічнага абсталявання. У выніку рэканструкцыі ўсё належнае атрымала рэанімацыйнае аддзяленне.

На базе Мінскай абласной бальніцы размяшчаюцца некаторыя кафедры Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі, такія, як кафедра ўралогіі, траўматалогіі, фізіятэрапіі, хірургіі, клінічнай фармакалогіі і тэрапіі, а таксама цэнтры рэспубліканскага прызначэння — уралогіі і андралогіі, мікрахірургіі, хірургічнай гастраэнтэралогіі і калапракталогіі. Кожны з цэнтраў і кафедраў курыруе пэўнае аддзяленне.

Укараненне новых тэхналогій патрабуе, безумоўна, вялікіх фінансавых выдаткаў, але менавіта яны ў выніку дазваляюць эканоміць. Напрыклад, пераломы сцягна — даволі частая траўма — патрабуе дарагога аперацыйнага ўмяшання. Але пасля яго праапераваны пакідае стацыянар ідэальна праз 10—15 дзён, хутчэй становіцца працаздольным у адрозненне ад лячэння шкілетным выцяжэннем, якое доўжыцца каля двух месяцаў.

У траўматалогіі цяперактыўна развіваецца эндапратэзаванне суставаў. Па рэспубліцы ў цэлым і па Мінскай вобласці ў прыватнасці чарга на эндапратэзаванне тазасцегнавых суставаў складала дзесьці не менш як два гады. І толькі апошнім часам дзякуючы расшырэнню штату, закупцы новага абсталявання ўдаецца істотнымі тэмпамі павялічваць колькасць патрэбных аперацый. Калі ў 2005 годзе іх было каля 150, то ў 2006-м — каля 300, 2007-м — звыш 600. Мяркуецца, што ў бліжэйшыя гады памянёная вышэй чарга будзе складаць не больш як 2—3 месяцы.

Абнаўленне эндаскапічнага аддзялення дазваляе рабіць не толькі дыягнастычныя даследаванні, але і эндаскапічныя аперацыі, дыяпазон якіх пашыраецца. З дапамогай ультрагукавых тэхналогій не толькі дыягнастуюцца, але аднасова і дрэніруюцца, пункціруюцца розныя абсцэсы, утварэнні, кісты і г.д. Наогул малаінвазійныя — малатраўматычныя тэхналогіі актыўна прыжываюцца не толькі ў хірургіі. Лапараскапічныя аперацыі робяцца ўжо ва ўралогіі і траўматалогіі, на чарзе — нейрахірургія.

Летась у бальніцы адкрыўся абласны кардыялагічны цэнтр, кардыяхірургічнае аддзяленне і неўралагічнае № 2, якое займаецца вострымі парушэннямі мазгавога кровазвароту — інсультамі. У планах — адкрыццё аддзялення рэнтгенэндаваскулярнай хірургіі.

— У 2006-2007 гадах бальніца забяспечыла патрэбы вобласці ва ўстаноўцы электракардыясты-мулятараў, — расказвае Яраслаў Пералыгін. — Яны, як вядома, дапамагаюць змагацца з такой праблемай, як брадыарытмія, калі сэрца б'ецца рэдка, а ў гэтым годзе плануецца набыць прыбор, які дазваляе лячыць тахіарытмію, калі сэрца, калі так можна сказаць, б'ецца часта. У нас быў адзін ангіяграфічны апарат, які дазваляў рабіць ангіяграфію перыферычных сасудаў і не дазваляў выконваць каранараграфію. У хуткім часе мы ўстановім другі ангіёграф, які дазволіць праводзіць каранараграфію і рэнтгенэндаваскулярныя аперацыі.

Развіццё сасудзісцай хірургіі дазваляе эфектыўна прафілактаваць інфаркты і інсульты: з кожным годам мы будзем выконваць большую колькасць аперацый на сонных артэрыях, паколькі атэрасклероз як адна з прычын указаных вышэй захворванняў паражае ўсе артэрыі, у тым ліку і сонныя...

У мінулым годзе бальніца перажыла 65 укараненняў, чатыры з якіх — гэта вынаходніцтвы і два — заяўкі на новае абсталяванне. Скажам, на кафедры хірургіі ўстаноўлены новы беларускі троххвалевы лазар. Праз нейкі час будзе закуплена яшчэ тры такія цуда-апараты, якія будуць выкарыстоўвацца ў розных накірунках, паколькі новы лазар у адрозненне ад папярэднікаў дазваляе мяняць даўжыню хвалі. З дапамогай дадзенага малаінвазійнага метаду можна змагацца, напрыклад, з венознымі праблемамі, лячыць тыя ж трафічныя язвы, расшыраць жоўцевыводзячыя пратокі.

— З кожным годам магчымасці нашай установы будуць расці, але я хацеў бы падкрэсліць, што медыцыне належыць усяго 12—15 працэнтаў поспеху ў забеспячэнні здароўя канкрэтнага чалавека і нацыі ў цэлым, — адзначае Яраслаў Пералыгін. — Асноўнае ў гэтай справе — лад жыцця, у тым ліку своечасовая кансультацыя ў спецыяліста. Такая ўстанова, як наша, павінна адпавядаць свайму прызначэнню і дапамагаць у першую чаргу тым, каму не ўдаецца дапамагчы на гарадскім ці раённым узроўнях. Дарэчы, там сёння таксама павышаецца якасць і колькасць медыцынскіх паслуг. Наша задача — браць на сябе складаныя, але ж не ў сэнсе запушчаныя выпадкі.

Мяркую, што высокаспецыялізаваны, дарагі бальнічны ложак ніяк не можа ператварацца ў ложак сацыяльны. Такія людзі павінны знаходзіцца, напрыклад, у бальніцах сястрынскага догляду, а такіх у нас пакуль, на жаль, не дастаткова.

Святлана БАРЫСЕНКА.

Вясковы «Вітэкс»

Так называецца яшчэ і сельскагаспадарчы комплекс на Міншчыне, які не так даўно прадпрыемства выкупіла. Карэспандэнт «Звязды» завітала ў незвычайную гаспадарку.

Ахайныя прыгожыя дамкі, утульная сталовая, больш падобная на кавярню, дагледжаныя і адбудаваныя нанова мяса-малочныя фермы — са спецыяльнымі боксамі для гадавання цялят у першыя тыдні іх жыцця (як інкубатары для нованароджаных дзетак), з ладнымі, вычышчанымі стойламі і прасторнымі выгуламі, з выдатна абсталяваным даільным залам. Ці маглі ўявіць працаўнікі СВК «Цеплень» яшчэ нейкіх тры гады таму, што каровы будуць хадзіць на даенне па гумавай падлозе і ў кожнай з іх будзе свая магнітная картка — гэткае дасье з усёй паднаготнай: ад стану здароўя — да колькасці «здадзенага» малака? Наўрад ці. Гаспадарка тады не тое што сераднячком трымалася — плялася ў хвасце, нават замыкала шэсце: «Цеплень» стабільна займала 16-е месца з... 16 гаспадарак Уздзенскага раёна — і па ўраджаі збожжавых, і па надоі малака, і па прывагах мяса...

Абанкручаная гаспадарка, зразумела, была б ліквідаваная, калі б паводле ўказа кіраўніка дзяржавы яе разам з многімі іншымі «небаракамі» сельскай гаспадаркі не выкупілі паспяховыя прыватныя прадпрыемствы. «Цеплені» пашчасціла перайсці на баланс «Вітэкса» — лідара ў вытворчасці айчыннай касметыкі. І за гэтыя тры з паловай гады і не менш як 10 мільярдаў інвеставаных рублёў адбылося ператварэнне брыдкага качаняці ў прыгожага лебедзя. Сёння сельскагаспадарчы комплекс «Вітэкс» у раёне сярод лідараў:

— Ураджайнасць збожжавых вырасла больш чым у два разы, — з задавальненнем прыводзіць аптымістычныя лічбы **дырэктар сельскагаспадарчага філіяла «Вітэкс» Леанід БАТУРА**, — малака сталі надойваць амаль у чатыры разы больш. Ад гэтага, вядома ж, выраслі і продажы нашай прадукцыі. Па выніках мінулага года мы на першым месцы па надоях малака і аб'ёмах нарыхтоўкі кармоў, на другім — па ўраджайнасці збожжавых, на трэцім — па сярэднясуткавых прывагах мяса. Гэта пры тым, што ў самой Цеплені не надта ўрадлівыя глебы і доўгі час гаспадарка была ў заняпадзе. Калі не браць у разлік інвестыцыі, то можна лічыць, што комплекс выйшаў на прыбытак, цяпер мы можам за кошт уласных сродкаў выплачваць зарплату сваім працаўнікам, пакрываць выдаткі на ўтрыманне гаспадаркі (ацяпленне і гэтак далей). Аднак асноўную нагрузку бярэ на сябе наша галаўное прадпрыемства — «Вітэкс»: закуп тэхнікі, рэканструкцыя старых будынкаў і ўзвядзенне новых. Без гэтага нічога б не было... Новая тэхніка дазваляе нам спраўляцца з аб'ёмамі і тэмпамі сельгаскампаній, а найлепшае таму пацвярджэнне — высокія паказчыкі нашай працы, у тым ліку і тое, што мы першымі ў раёне пасеялі азімыя.

Гаспадарка за тры гады новага жыцця дала працу некалькім дзесяткам чалавек, а ў перспектыве — з будаўніцтвам цэхаў па вытворчасці ўпакоўкі і экстрактаў траў — з'явіцца яшчэ не адна сотня працоўных месцаў. Тым больш што ахвотнікаў працаваць у сельскагаспадарчым комплексе «Вітэкс» хоць адбаўляй. Яно і зразумела, бо пра людзей тут клапоцяцца: зарплату выдаюць у час (дзевятае чысло кожнага месяца — жалезна), на ўсіх трох фермах ёсць ці хутка з'явяцца санітарныя пакоі, душавыя, раздзявальні, будуецца службовае жыллё. 16 працаўнікоў пераехалі ўжо ў новыя дамы, а некалькі катэджаў узводзяцца літаральна зараз. Вядзецца будаўніцтва яшчэ і двухкватэрнага дома для дзвюх маладых сем'яў.

— Мы ўвогуле робім стаўку на маладых і актыўна заахвочваем іх да працы, — кажа Леанід Іванавіч. — Начальнікам комплексу на ферме «Каранеўскія» ў нас працуе малады спецыяліст Максім Астапенка. Ёсць і маладыя механізатары, і маладыя даяркі. Для такіх працаўнікоў мы плануем пабудаваць утульны камфортны інтэрнат.

Шмат чаго тут пераменіцца літаральна ў наступныя некалькі гадоў, аднак у гаспадарцы і зараз ёсць што паказаць. Не грэх пахваліцца мясцовай сталовай, аснашчанай самым сучасным абсталяваннем. Кухню яе, прынамсі, аціналі і на галаўным прадпрыемстве — гатовыя абеды штодзень возяць у Мінск.

Самі фермы і гасцям хацелася наведаць, і гаспадарам — паказаць, таму экскурсію для нас правялі з задавальненнем. Нашым гідам у падарожжы па фермах (дзве з іх — Каранеўскія і Каладзіно — малочнатварныя, а у трэцяй — Прохадах — займаюцца вырошчваннем маладняку) стаў намеснік дырэктара па жывёлагадоўлі сельскагаспадарчага комплексу «Вітэкс» Мікалай Шкробат. Сам ён паводле спецыяльнасці ветэрынар, пасля яго цікавых, дасціпных расказаў мы цяпер літаральна самі можам гадаваць цяля. Жарты жартамі, а ўмовы на вітэксаўскіх фермах такія, што астатнія гаспадаркі могуць пазайздросціць... У стойлах чыста (гной пасля ачысткі адгружаецца і адразу ж вывозіцца на палі), жывёлу трымаюць без прывязі, корм падаецца механізавана; пакуль ідзе ўборка бруду, каровы на прагулцы — атрымліваюць вітамін D, як кажа Мікалай Мікалаевіч. Асабліва прыемна, відаць, яго атрымліваць у новых, прасторных выгулах. Самых малых «жыхароў» фермаў, якія толькі-толькі з'явіліся на свет, таксама не пакрыўдзілі: для іх нядаўна закупілі новыя дамкі — боксы з кармушкамі і паілкамі накшталт дзіцячых бутэлечак. Ветэрынар аглядае малых найбольш уважліва.

У Каранеўскіх змешчаны сучасная даільная зала, дзе

насцелена гумавая падлога і спецыяльнае абсталяванне счытвае з асабістай карткі кожнай каровы інфармацыю, што захоўваецца ў памяці камп'ютара. Калі карова захварэла, гэта інфармацыя абавязкова фіксуецца, яе малако выбракоўваецца. Для вызначэння якасці малака ёсць тут і свая міні-лабараторыя. У малочным блоку стаяць рэкуператары, якія дазваляюць эканоміць энергію.

Фермы — гэта далёка не ўся гаспадарка «Вітэкса». Тут ёсць яблыневы сад, які налета дасць першы ўраджай. З кожным годам дрэў там становіцца ўсё больш і, паводле планаў, яны зойміуць тэрыторыю звыш 50 га. Ёсць у «Вітэкса» і свой пчальнік. Пакуль у ім 130 сем'яў, размешчаных у своеасаблівых трэйлерах, што дазваляе пчолам «падарожнічаць», а пчалаводам — збіраць мёд розных ураджаяў: з рапсу, грэчкі і гэтак далей. Ёсць планы зрабіць тут стацыянарны пчальнік на 200 сем'яў ці нават больш. Мёд пойдзе не толькі на рэалізацыю, але і ў вытворчасць касметыкі. Планаў у **генеральнага дырэктара кампаніі «Вітэкс» заслужанага працаўніка прамысловасці Беларусі Віктара ЦЯРЭШЧАНКІ** багата, як і ідэй для іх рэалізацыі:

— У сваім сельскагаспадарчым філіяле мы імкнёмся максімальна збліэіць сельскую гаспадарку і сваю асноўную вытворчасць, хоць, натуральна, у іх няшмат агульнага. Тым не менш задумы ў нас ёсць. Узяць хоць бы экстракты траў, якія мы ў ліку іншых кампанентаў выкарыстоўваем пры вытворчасці касметыкі, — іх даводзіцца закупляць за мяжой. А чаму б не скарыстаць уласныя пасяўныя плошчы і з вырашчаных у сваёй гаспадарцы рамонку, мелісы, календу лы, шалфею і не стварыць экстракты? Такое імпартазамяшчэнне дазволіць і якасць прадукцыі павысіць, і сродкі зэканоміць. Мяркуем, што сёлета будаўніцтва цэха ўдасца закончыць і налета пачнецца вытворчасць беларускіх экстрактаў, паспрабуем таксама вытворчасць фітачаёў. У тым ж тэрміны, спадзяёмся, пачнецца і выпуск слоічкаў ды бутэлечак для касметыкі ва ўласным цэху па вытворчасці ўпакоўкі. Гэты цэх будуецца ў дадатак да тых вытворчых плошчаў, якімі мы валодаем у сталіцы, паколькі іх ужо недастаткова для выпуску прадукцыі ў патрэбных аб'ёмах — мы ўвесь час нарошчваем сваю вытворчасць. Нам не хацелася б спыняцца выключна на продажах сыравіны, якая вельмі танная, мы плануем разам з вытворчымі цэхамі стварацъ і прадпрыемствы па перапрацоўцы, бо продаж гатовай прадукцыі дазволіць зрабіць вытворчасць больш рэнтабельнай. Скажам, не проста яблыкі рэалізоўваць, а сокі, джэмы, канфіцюры, зробленыя з іх. У перспектыве хацелася б выпускаць гатовую прадукцыю мясной і малочнай вытворчасці.

Аднак не толькі пра прыбыткі клапоціцца кіраўнік, пра дабрабыт людзей ён турбуецца не менш:

— Наша задача — забяспечыць людзям годныя ўмовы працы, пражывання і адпачынку, каб не горш за гарадскія былі. Мы досыць актыўна будуем жыллё, плануем газіфікаваць мясцовасць, адчыніць краму з усімі неабходнымі таварамі (каб не трэба было па кожную дробязь у горад ездзіць). Час ад часу прыязджае з Мінска цырульнік, для гэтага ў Цеплені пакуль абсталяваны адзін пакойчык, а ў будучым мы адчынім там сваю цырульню. Ёсць планы, каб у сельскагаспадарчым комплексе вёў прыём доктар, які зараз працуе ў медпункце на нашым галаўным прадпрыемстве: будзе створаны графік, завядуць медыцынскія карткі для нашых працаўнікоў. Комплексна прадумваем сферу адпачынку: абавязкова пабудуем спартыўныя пляцоўкі для гульні ў футбол, валейбол, баскетбол, а таксама тэніснымі і більярдныя сталы паставім. Хочацца давесці да ладу і мясцовы Дом культуры, хоць ён і не на нашым балансе, аднак трэба ж, каб было месца для правядзення святаў, прыёмы артыстаў. Задумваемся і пра будаўніцтва летняй эстрады. Карацей, ва ўсіх сферах будзем паляпшаць умовы: і ў працоўнай, і ў побытавай, і ў забаўляльнай.

Пры ўсім гэтым кіраўніцтва сельскагаспадарчага комплексу «Вітэкс» чуйна рэагуе на патрэбы людзей, і на тое, што сапраўдны запатрабавана, грошай не шкадуе. Цяпер па жаданню людзей капліцу будуюць.

Грошы ўкладзены немалыя, а пра прыбытак пакуль гаварыць не даводзіцца, тым не менш выдаткі апраўданыя ўжо хоць бы таму, што вёска змянілася, зажыла па-новаму — не матэрыяльнае, дык маральнае задавальненне кіраўніку дакладна забяспечана.

— Тое, што гаспадарка выйшла ў лідары, не можа не радаваць, — кажа Віктар Аляксеевіч. — І гэта не толькі дзякуючы інвестыцыям, падбору спецыялістаў (я ж калі толькі пачынаў працаваць з гаспадаркай, там не хапала знаўцаў сваёй справы практычна па ўсіх ключавых накірунках, давялося шукаць спецыялістаў) але і таму, што мы прывіваем любоў да працы, патрабуем належнага стаўлення да яе. У «Цеплені» многія працавалі абы як: на працоўны дзень не зважалі, прыходзілі нецвярозымі. Не было ні ўмоў, ні стымулаў да працы, пры гэтым рабочых рук не хапала, і людзі распускаліся яшчэ больш, маўляў, выганіш мяне — хто ж тут працаваць будзе? Давялося прымаць радыкальныя меры: выправілі на вытворчасць фельдшара, праверылі працаўнікоў на алкаголь, склалі акты і за дзень звольнілі пяцярых. Тыя, хто застаўся, сур'ёзна задумаліся, ну а калі зарплаты паднялі, тады ў працаўнікоў увогуле з'явілася жаданне трымацца за сваё месца. І гэта вельмі важна, бо ад кадраў залежыць усё: якія грошы ні ўкладвай і новыя тэхналогіі ні выкарыстоўвай, усё марна, калі людзі ставяцца да справы нядбайна. Наша ж задача — стварыць квітнеючы, ладны пасёлак, з цудоўнай інфраструктурай — разам з людзьмі і для іх.

І верыцца, што ў сельскагаспадарчага філіяла «Вітэкса» гэта абавязкова атрымаецца. Са з'яўленнем новых цэхаў ён стане самым буйным вытворчым комплексам на Уздзеншчыне, што дадасць сродкаў і ў раённы бюджэт. І чым больш такіх дагледжаных, спраўных гаспадарак, тым багацейшая вобласць...

Ала МАЧАЛАВА. Фота аўтара.

Я пад жнівеньскім сонцам частаваўся з лагойскіх крыніц,
Пад Нясвіжам увосень браў грыбы з-пад змакрэлых ігліц,
Чуў зімой, як спявае завея пра слуцкіх ткачоў,
І вясною пад Нарачам зноў улюбляўся і зноў —

Я любоюю жыву да радзінных шляхоў і палёў,
Да валошак ў аблогах і ў высях званцоў-жаўрукоў
І калі хтосьці мне прапануе дарогу ў рай —
Не паеду. Ніколі не кіну цябе, белы Край.

Яўгена ЛЯСЕЦКАГА

фота слова

ДАХОД У ЗВЯЗЦЫ З ДАПАМОГАЙ

60 долараў прыбаўкі

Статыстыка сведчыць, што асноўнай крыніцай даходаў абсалютнай большасці беларусаў з'яўляецца зарплата, і ў гэтым плане Міншчыну нельга назваць выключэннем. Таму на аплаце працы трэба спыніцца больш падрабязна. Як адзначае Ала Мікалуцкая, пад'ём эканомікі вобласці прывёў да росту заробкаў, калі ў 2000 годзе іх сярэдні паказчык складаў 73, то ў 2006 годзе — 265, а, паводле аператыўных даных, у 2007 годзе — 325 долараў ЗША. Такім чынам, летась па агульным узроўні зарплаты рэгіён «сплюсаваў» на 60 долараў, што нават крыху перавысіла прагноз. І, як чакаецца, па выніках 2008 года зноў-такі сярэдніе заробкі па Міншчыне павінны выйсці на аднаго 352, а 2010 года — 500 долараў у эквіваленце.

— Асаблівая ўвага надаецца не толькі росту зарплаты, але і своечасовасці яе выплат, — кажа Ала Мікалуцкая. — Гэта праблема была вельмі вострай яшчэ ў 2000—2003 гадах, аднак зараз сітуацыя прыйшла ў норму. Час ад часу пытанні ўзнікаюць толькі па асобных суб'ектах гаспадарання, якія знаходзяцца ў стадыі рэфармавання ці рэарганізацыі. Міншчына пачала новы год без даўгоў. І гэта з улікам таго, што мы разам з прафсаюзамі настаялі на норме — у калдагаворах усіх арганізацый апошнім тэрмінам выплат павінна быць не 30-е, а 25-е чысло.

Да слова, зноў-такі дзякуючы супрацоўніцтву з прафсаюзамі ўдалося зменшыць і колькасць выпадкаў вытворчага траўматызму. І ў тым ліку ў такой заўсёды няпростай сферы, як сельская гаспадарка.

Лепш менш. Але... больш

Рост заробкаў і пенсій прынёс канкрэтны вынік: калі ў 2000 годзе даходы, ніжэйшыя за аднаго бюджэту пражыткоўага мінімуму мела амаль трэць насельніцтва вобласці, то зараз — ужо каля 10 працэнтаў. Аднак, заўважае Ала Мікалуцкая, тут нельга забывацца на адзін відавочны факт — Міншчына мае ці не самую высокую долю жыхароў у паважным узросце. Прычым значнай іх частцы неабходна сацыяльная дапамога, дастаткова сказаць, што цяпер у рэгіёне налічваецца 20 699 цалкам адзінокіх пенсіянераў, а яшчэ 120 580 састарэлых жывуць асобна ад дзяцей і іншых працаздольных сваякоў.

— Абследаванні ўмоў жыцця гэтых людзей праводзяцца як мінімум двойчы ў год, у выпадку неабходнасці ім прапануецца тая ці іншая падтрымка, і не ў апошнюю чаргу — абслугоўванне дома, — заўважае Ала Мікалуцкая. — Пасля пашырэння практыкі прадстаўленння сацыяльных паслуг дома на платнай аснове ў 2001 годзе мы свядома вырашылі вызначыць самы нізкі па краіне тарыф — 592 рублі за гадзіну. І не памыліліся, прынамсі, зараз сацыяльныя работнікі наведваюць 23 879 пенсіянераў і інвалідаў, а ў разліку на 10 тысяч атрымалнікаў пенсій гэты паказчык — удвая большы, чым у сярэднім па Беларусі. Малюнак не змяніўся нягледзячы на тое, што са жніўня мінулага года тарыф павялічыўся да тысячы рублёў. Аплата засталася даступнай, тым больш што з 2001 года сярэдні памер пенсіі павялічыўся амаль у 9 разоў. І плюс да таго на папулярнасці надомнага абслугоўвання адбіваецца такая акалічнасць — сёння ў вобласці сацыяльныя работнікі могуць наведваць усе, нават аддаленыя населеныя пункты.

Паслугі дома аказваюцца праз тэрытарыяльныя цэнтры сацыяльнага абслугоўвання. Аднак толькі гэтым дзейнасць цэнтраў не абмяжоўваецца. Так, заўважае Ала Мікалуцкая, уводзяцца новыя віды дапамогі. Калі ў пачатку 2007 года на Міншчыне было толькі 9 аддзяленняў дзённага знаходжання для дзяцей-інвалідаў, то цяпер яны ёсць ужо ў кожным раёне. Зноўтакі паўсюль можна скарыстацца паслугамі сядзелкі ці гаспадарчых брыгад, што займаюцца нарыхтоўкай дроў, абрэзкай дрэў, дробным рамонтамі. Апроч таго, у Капыльскім, Валожынскім і Клецкім раёнах працуюць сацыяльныя цырульні, у Любанскім, Мядзельскім раёнах і ў Маладзечне дзейнічаюць міні-пральні, у Валожынскім раёне створана сацыяльная майстэрня па рамонце абутку, у трох раёнах з'явіліся рэабілітацыйна-працоўныя майстэрні, у пяці раёнах — пункты пракату сродкаў рэабілітацыі, а ў шасці раёнах — швейныя майстэрні і камп'ютарныя класы.

Адсутнасць уласнага абласнога цэнтра, вялікая доля вясковых жыхароў, міграцыя моладзі ў сталіцу і, адпаведна, значная колькасць асобаў у пажылым узросце. Усё гэта можна назваць традыцыйнымі асаблівасцямі Міншчыны. На што тут робіцца стаўка, як зменіцца сацыяльная інфраструктура вобласці і якія новыя віды дапамогі будуць прапанаваныя яе жыхарам у бліжэйшы час? Пра гэта карэспандэнт «Звязды» гутарыў са старшынёй Камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінаблвыканкама Алай МІКАЛУЦКАЙ.

Нарэшце, літаральна днямі пры тэрытарыяльным цэнтры сацыяльнага абслугоўвання Мінскага раёна адчынілася аддзяленне кругласутачнага знаходжання для грамадзян пажылога ўзросту. Пры гэтым да канца года такія ж аддзяленні павінны з'явіцца на Мядзельшчыне, Слуцчыне і Бярэзіншчыне.

Аднак ці не самым адметным сёлетнім праектам павінна стаць адкрыццё аддзялення рэабілітацыі для інвалід

Заснавальнікі — установа «Рэдакцыя газеты «Звязда» і грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Рэгістрацыйны № 12.

18

СТУДЗЕНЯ
2008 г.
ПЯТНІЦА
№ 3 (15507)

ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

Дыскусія прафесіяналаў

РЭФОРМА ШКОЛЫ: РЭВІЗІЯ ЗДЗЕЙСНЕНАГА...

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Галоўнай тэмай рэспубліканскай нарады, якая прайшла на мінулым тыдні ў сценах Ліцэя БДУ, стала рэформа беларускай школы. Па праграме 12-гадовай школы навучаюцца на сёння ўжо 75 працэнтаў беларускіх школьнікаў. Першы выпуск з базавай 10-гадовай школы мае адбыцца ўжо сёлета, а з 12-гадовай школы першы выпуск чакаецца ў 2010 годзе. Тым больш дзіўна, што на 10-м годзе ажыццяўлення рэформы ўсё часцей сталі гучаць не проста крытычныя водгукі аб тых ці іншых аспектах арганізацыі вучэбнага працэсу ў рэфармуемай школе, а сумненні ў мэтазгоднасці расцягвання навучання на 12 гадоў, пачатку навучання з шасцігадовага ўзросту і планаванага пераходу старшай ступені школы на прафільнае навучанне. Апанен-ты рэфармуемай школы не могуць зразумець, навошта было адмаўляцца ад адной з наймацнейшых адукацыйных мадэляў у свеце. Няўжо эфектыўна дзеючай сістэме быў патрэбны «капітальны рамонт»? І што рэфармуемая школа набыла ўзамен? Вучэбныя нагрузкі на школьнікаў не зменшыліся, здароўе падрастаючага пакалення працягвае пагаршацца, а замест новых падручнікаў застаецца незразумелым не толькі школьнікам, але і іх бацькам, якія нічым не могуць дапамагчы свайму дзіцяці. Таму і дыскусія на нарадзе атрымалася эмацыянальная.

Як зазначыў у сваім выступленні перад калегамі **міністр адукацыі Аляксандр РАДЗЬКОЎ,** глабальная інфарматызацыя грамадства патрабуе пастаяннага ўдасканалення сістэмы адукацыі. Дарэчы, адной з самых складаных задач, якія стаялі перад рэфармуемай школай, было вызначыць, чаму вучыць дзяцей у XXI стагоддзі? Зразумела, што за пастаянным абнаўленнем інфармацыйнага поля не можа паспець ніводны падручнік. У Міністэрстве адукацыі лічаць, што змест падручнікаў новага пакалення ў большай ступені, чым раней, зарыентаваны на развіццё асобы навучэнцаў. Да бясспрэчных плюсоў можна аднесці іх практычную і выхаваўчую накіраванасць, лагічнасць і паслядоўнасць выкладання вучэбнага матэрыялу, паслядоўнасць выкладання вучэбнага матэрыялу, паслядоўнасць выкладання вучэбнага матэрыялу,

ПАНЯДЗЕЛАК, 21 СТУДЗЕНЯ

5.25 Дак. серыял «Еўропа. Погляд зверху».
6.20, 7.05, 8.10 Добрай раніцы, Беларусь!
6.45, 7.45, 18.50, 1.15 Зона Х.
7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 16.00, 18.00, 19.00, 23.40 Навіны.
7.30, 8.25 Дзелавое жыццё.
8.20 Гатуем разам.
8.30 У свеце матораў.
9.05 Галерэя вобразаў.
9.35 Фігуры.
10.05, 16.45 Серыял «Трымай мяне мацней».
10.55, 17.40 Серыял «Каханне як каханне-2».
12.15 Дэтэктыў «Месца сустрэчы змяніць нельга».
13.35 Дак. серыял «Тайны забытых перамог».
14.00 Здароўе.
14.30 Nota Bene.
15.15, 19.20 Навіны рэгіёна.
15.30 Культурныя людзі.
16.00 ЕўраФэст. Дзень за днём.
16.15 Час кіно.
19.35 Час спорту.
20.00 Ток-шоў «Ход у адказ». Сацыяльная адказнасць бізнэсу.
21.00 Панарама.
21.45 Фінал Нацыянальнага тэлевізійнага музычнага праекта «ЕўраФэст».
23.45 Камедыя «Сюрпрыз».

Прачнуўшыся аднойчы ў атэлі «Беверлі Хілз», Джэйк знаходзіць побач труп агента ФБР, а пад ложкам — чамадан з 250 тысячамі долараў. Пры гэтым ён нічога не памятае!
1.20 Серыял «Клава, давай!».

6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.00, 3.00, 5.00 Нашы навіны.
6.05 «Наша раніца».
9.05 Контуры.
10.10, 11.10 Камедыя «Гэта ўсё кветачкі...».
11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00, 23.15, 3.20 Навіны спорту.
12.00 «Малахаў+».
13.10 Серыял «Не радзіся прыгожай».
14.10 «Прыгоды Джэкі Чана».
14.30 «Кантрольная закупка».
15.00 «Дачка садоўніка». Серыял.
16.15 Меладрама «Толькі ты».
18.20 «Шчаслівыя разам». Серыял.
18.55 Чакай мяне.
20.00 Час.
21.05 Ток-шоў «Выбар».
22.00 «Громавы». Серыял.
23.20 «Дакументальны дэтэктыў». «Куля для дэпутата».
23.55 Трылер «Доўгі пацалунак на ноч».
2.10 «Абаронца». Серыял.
Тэхнічная прафілактыка з 3.30 да 5.00.
5.05 «Няхай гавораць» з Андрэем Малаховым.

Знаёмыя яны яшчэ з дзіцячага дома і заўсёды гатовы выручыць адзін аднаго. Адважная чацвёрка ўступае ў барацьбу з мафіяй, хоць сілы яўна не роўныя.



6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30,19.30, 22.30 «24 гадзіны».
6.10, 17.20 «Міншчына».
6.20 «З чаго пачынаецца раніца».
7.40 «Наша справа».
7.55 «Вялікае сняданне».
8.30, 16.50 «Вовачка-1». Серыял.
9.00 «Тыдзень».
10.00 «Спартыўны тыдзень».
10.40 «Наш дом».
11.00 «Рэбека». Серыял.
11.50 «Дарагая перадача».
12.15 «Магічны Алтай». Дак. фільм.
13.00 «Ёсць кантакт».
13.50 «Культурнае жыццё».
14.20 «Далёкія сваякі».
14.45 «Магутныя рэйнджары. Касмічны патруль «Дэльта». Мультсерыял.
15.10 «Элен і рабяты». Серыял.
15.45 «Народжаныя ў СССР».
17.30 «Званая вячэра».
18.25 «Танга ўтраіх». Серыял.
20.00 «СТБ-спорт».
20.10 «Добры вечар, малы».
20.15 Маст. фільм «Ваўкадаў».

Ён быў асуджаны на гібель, але выжыў, каб адпомсціць за знішчэнне свайго роду. Апошні чалавек з племені Шэрых Сабак стаў магутным воінам, які называў сябе Ваўкадавам.
22.55 «Закон і крымінал».
23.00 «Спецназ». Серыял.
23.45 «Сталічны футбол».
0.15 «Гучная справа».
1.05 «Рэдакцыя». Серыял.

4.00, 5.00, 6.00, 7.00 Зараджайся!
4.30, 14.00 Серыял «ОБЖ».
5.30 Вясельныя вар'яцтвы.
6.30 Удачная пакупка.
7.30 «Разам».
8.30, 11.30, 14.30, 17.30, 20.30 «Навіны Садружнасці».
9.00 Любоўныя гісторыі.
9.30 Хіт-экспрэс.
10.30 Серыял «Дзікі месяц».
12.00, 22.25 Студыя 60х90.
12.15, 22.30 Маст. фільм «Нябесны ціхаход».
13.45 Урокі англійскай мовы.
15.00 Дак. серыял «Самыя дзіўныя святы свету».
16.00 «Гадзіна суда». Справы сямейныя.
17.00 Дак. серыял «Дзіўнае жыллё».
18.10 Серыял «Рускія амазонкі».
19.15 «Цік-так».
19.30 «Агульны інтарэс».
20.00 Рэспубліка — сёння.
21.00 Серыял «Лаура і Зоя».
22.00 Акцэнты.



7.00—16.30 *Прафілактыка эфірнага абсталявання.*
16.30 «Жыццё, поўнае радасці».
17.00 «Мультпарад».
17.20 «Фантастыка і прыгоды».
18.50 «Навіны кіно».
19.00 «Мой любімы гадаванец».
19.15 «Зялёны дом».
19.25, 21.05 «Распродаж. Навінкі. Акцыі».
19.30 Серыял «Месца сустрэчы змяніць нельга».
20.45 «Вечарніца».
21.00 Інфармбюро «Міжнароднае».
21.10 Баявік «Прыстанак зла».
23.00 «Метэапрагноз».

7.00 Дэтэктыў «Зорка шэрыфа».
9.10 «Паўсухі закон. Схватка са Зміем».
10.00 Пакой смеху.
10.50 «Сумленны дэтэктыў».
11.20 «Спецыяльны карэспандэнт».
11.50 «Фітыль».
12.50 Серыял «Пером і шпагай».
13.50, 16.50, 18.50, 23.00 Весткі—Беларусь.
14.00, 17.00, 19.00 Весткі.
14.20, 19.30 Мясцовы час. Весткі—Масква.
14.35 «Кулагін і партнёры».
15.05 Суд ідзе.
15.55 Серыял «Скрадзеныя пацалункі».
17.30 Мясцовы час. Весткі—Маскоўская вобласць.
17.50 Серыял «Анёл-ахоўнік».
19.50 Добрай ночы, малыя!
20.00 Серыял «Тайны следства-5».
21.00 Серыял «Опер Крук».
падзеяў у краіне. Ён — грамадскі дзеяч, дзяржаўнік — аказаўся адстароненым ад галоўных клопатаў краіны. І не толькі заставаўся ўбаку, але і адчуваў магутны прэсінг, ціск з мэтай адрыву яго ад новай улады і залічэння да апазіцыі.

(...)

Мяне асабліва непакоіў моцны ціск на Васіля Уладзіміравіча з мэтай вывесці яго на вуліцу, на мітынговыя зборышчы, зрабіць яго кіраўніком мітынгу, паказаўшы, што на чале растрывожанага натоўпу стаіць не які-небудзь рабочы сцэны, фотограф або прадавец, а сам Васіль Быкаў — народны пісьменнік, улюбёнец грамадзян

Васіль Быкаў. КАМБАТ. ПІСЬМЕННІК. СЯБАР

Анатоль СУЛЬЯНАЎ

Васіль Уладзіміравіч запаволена і няроўна прыадкрыў вочы, павёў імі па баках; я спыніў дыханне «рот у рот», спадзеючыся, што яго арганізм пачаў дзейнічаць, і ён вось-вось вернецца ў звычайны, але расслаблены стан. Нарэшце «наш хворы» адкрыў вочы, нешта ціха спытаў і зрабіў спробу прыпадняцца. Але мы не дазволілі яму гэта зрабіць. Тут жа падбегла жанчына ў белым халаце, адштурхнула нас, праслухала з дапамогай фанендаскопа, памацала пульс, і тут жа зрабіла ўкол.

Праз гадзіну Васіль набыў амаль звычайны знешні выгляд. І запрошаныя, шумна перагаворваючыся, расселіся па сваіх месцах. А найбольш актыўныя з іх узяліся разліваць спіртныя напоі, раскладаць закускі. Многія размаўлялі даволі гучна, перашкаджаючы адзін другому, не звяртаючы ўвагі на суседзяў. Спробы Васіля Быкава і Пімена Панчанкі супакоіць найбольш шумлівых не адразу дасягнулі мэты. І толькі званая неспакойная публіка прыціхла ў чаканні першага тосту, як раптам нехта з запозненых гасцей звярнуўся да прыціхлых напрэшце людзей:

— Гадзіну таму ў аўтамабільнай катастрофе загінуў Пётр Міронавіч Машэраў.

Усталявалася мёртвая цішыня, ніхто не прамовіў ні слова, усе застылі, пакуль нехта ціха здзіўлена не сказаў:

— Не можа быць...

«Найперш я трымаюся Праўды».
Васіль БЫКАЎ.

— Народны пісьменнік Беларусі,

— лаўрэат двух дзяржаўных прэмій БССР,

— дэпутат Вярхоўнага Савета рэспублікі,

— дэпутат З'езда народных дэпутатаў СССР,

— кавалер ордэнаў і медалёў СССР.

Як жа можна «жыць не ў ладах з уладай», калі раён, вобласць, горад і дзяржава прадстаўлялі і ўзнагароджвалі Васіля Уладзіміравіча вышэйшымі ўзнагародамі? І за кожную ўзнагароду Васіль Уладзіміравіч Быкаў дзякаваў уладзе. Я ні разу не чуў ад Васіля Быкава, каб ён у нечым быў незадаволены ўладай!

(...)

Заўважу, што В. Быкаў быў абсалютна бесканфліктным чалавекам. Адзіная арганізацыя, якой быў незадаволены Васіль Уладзіміравіч — гэта была цэнзура або Галоўліт. Вышэй адзначалася гэтая арганізацыя, чыноўнікі якой умешваліся бесцырымонна і часта ў творчасць пісьменніка («Мне не падабаецца трэці раздзел або «шосты»), прапаноўваючы выкінуць яго або перарабіць.

(...)

Васіль Уладзіміравіч вельмі перажываў яшчэ праз тое, што ён пасля актыўнай грамадскай дзейнасці застаўся ўбаку ад галоўных

Беларусі, лаўрэат разнастайных дзяржаўных прэмій, Герой працы, дэпутат! Сам Быкаў з намі!

(...)

У Веймары, у Германіі, ёсць грандыёзная бібліятэка, што носіць імя герцагіні Саксен-Веймарскай Ганны Амалін, аднагодкі расійскай Кацярыны Вялікай. Прыхільніца музаў, герцагіня запрасіла выхоўваць свайго сына самага славутага на той час ПІСЬМЕННІКА Віланда. Затым выхавацелем Карла Аўгуста стаў вядомы Гётэ са значным грашовым утрыманнем, пасля — Шылер. Невялікі гарадок Веймар стаў культурнай сталіцай Германіі, у якой неаднойчы бывалі, жылі, вычыліся рускія пісьменнікі Карамзін, Жукоўскі, Бацюшкаў, Гогаль, Цютчаў, Тургеневў. Немалы ўнёсак у вядомасць і росквіт Веймара ўнесла нявестка Карла Аўгуста, дачка расійскага імператара Паўла — Марыя; яна стала апякункай Гётэ і Шылера, Марыя Паўлаўна праклала шлях у Веймар кампазітару Феранцу Лісту.

Чытач можа спытаць: «А навошта вы пра гэта пішаце, калі да гэтага ішла размова пра Быкава?» А затым, каб яшчэ раз здзівіцца тым чэрствым, халодным адносінам... да выдатнага пісьменніка Васіля Быкава, які мог весці ва ўніверсітэце ўрокі мовы, тэхналогіі літаратурнай творчасці і пісьма, урокі літаратуры і гісторыі. Не лекцыі, а тэматычныя сустрэчы з моладдзю. Васіль Быкаў цудоўна ведаў гісторыю, быў знаёмы з філасофскімі поглядамі вучоных з сусветна вядомымі імёнамі, цудоўна валодаў этыкай і эстэтыкай, цікавіўся жывапісам і з вялікай увагай слухаў мастакоў-мэтраў Міхаіла Савіцкага, Віктара Грамыку, маладых Міколу Селешчука і Васіля Тоўсціка. З ім гутарка на любую тэму заўсёды цікавая і захапляльная, слухаць яго прыемна і лёгка, ён не абцяжарваў свае ўспаміны пра вайну, хоць яго аповеды, прынамсі для мяне, былі заўсёды і захапляльнымі, і новымі — ён не паўтараўся. І колькі б з вуснаў В. Быкава новага пачулі юнакі і дзяўчаты і з гісторыі, і з яго мастацкіх твораў, і з галіны мастацтва!

(...)

Наша начная гутарка з Васілём Уладзіміравічам аказалася апошняй — відаць, тады майстар прыняў рашэнне аб часовым ад'ездзе з краіны; не, ён не прамаўляў пра гэта ўголас, але відаць было па выразе вачэй, скаванасці ў размове, па тым , як ён двойчы паўтарыў адну і тую ж фразу: «Цяжкія абставіны змушаюць іншы раз рабіць нешта насуперак свайму жаданню». Не буду расшыфроўваць прыхаваныя думкі дарагога мне Васіля Уладзіміравіча — хай кожны, хто хоча гэта зрабіць, зробіць сам.

Мяне могуць спытаць: «Ці не пабойваліся вы ў той час, што В. Быкаў пакідае краіну назаўсёды?» Бясспрэчна, не! Я ведаў, што мой сябар абавязкова вернецца ў краіну, бо ён вельмі любіў сваю маму, сваю вёсачку на Ушаччыне, сваю рэчку, яблыні ў сваім садзе.

У першым жа лісце з Фінляндыі Васіль Уладзіміравіч паведамляў пра тое, што «нялюдскія абставіны вымушаюць іншы раз рабіць насуперак сабе, не як хацелася б...»

(...)

У дзень пахавання Васіля Быкава я доўга сядзеў ля труны сябра, успамінаў нашы сустрэчы, углядаўся ў яго супакоены твар, у яго белыя рукі, што так шмат зрабілі для народа...

І я прасіў у яго прабачэння; магчыма, некалі нечым засмуціў міласэрны, дарагога сэрцу, ціхага, але неспакойнага за іншых чалавека.

Прабач, дарагі Васіль Уладзіміравіч...

Прабач нас усіх...

(Пераклаў з рускай мовы Л. ГАЛУБОВІЧ.)

«Гарачы» тэлефон «Звязды» 287 17 41

«ПАДАЧА ВАДЫ Ў ВЁСКУ АДНОЎЛЕНА»

У рэдакцыю газеты «Звязда» па «гарачай лініі» паступіла скарга жыхаркі вёскі Перакопаўшчына Надзеі Дзмітрыеўны Кандраховай. Паводле яе слоў, мясцовых жыхароў перыядычна турбуюць праблемы з водаправодам, які часта выходзіць са строю.

У прыватнасці, як заявіла жанчына, ён не працуе з верасня мінулага года. Сітуацыю ўскладняе тое, што побач з вёскай знаходзяцца адстойнікі, таму раней санстанцыя забараніла браць ваду з калодзежаў і загадала засыпаць апошнія. «Зараз бяром ваду з калодзежа ў суседа, літаральна скрабём па дне. Звярталіся і да кіраўніцтва СВК «Вішнявецкі», на балансе якога знаходзіцца водаправод, і ў сельскі Савет, але праблема так і не вырашана», гаварыла Надзея Дзмітрыеўна.

Рэдакцыя звярнулася ў Стаўбцоўскі райвыканкам з просьбай правярыць дадзеную інфармацыю і па меры магчымасці дапамагчы ў вырашэнні азначанай праблемы мясцовых жыхароў.

Зварот газеты «Звязда» быў разгледжаны старшынёй раённага Савета дэпутатаў У. Бычко, старшынёй СВК «Вішнявецкі» В. Дэйкам і старшынёй Вішнявецкага сельскага Савета дэпутатаў Л. Міско.

«Факты, выкладзеныя жыхаркай вёскі Перакопаўшчына Надзеяй Дзмітрыеўнай Кандраховай, сапраўды мелі месца. 16 студзеня 2008 года СВК «Вішнявецкі» выканаў работы па замене вадзяной помпы, якая выйшла са строю, і падача вады ў вёску Перакопаўшчына адноўлена».

Сяргей РАСОЛЬКА.

ДЛЯ НАС КАРЫСНА ЎСЁ, ШТО ВЫГАДНА

«Круглы стол»: вядзе дырэктар Міжнароднага цэнтра інтэгрыйнай інфармацыі Таццяна БЯЛОВА.

Знарок не бяру загаловак у двукоссе, хоць гэта цытата. Так пачаў сваё выступленне на пасяджэнні «круглага стала» «Роля інфармацыйнай прасторы Саюзнай дзяржавы ў развіцці міжрэгіянальных эканамічных сувязяў Рэспублікі Беларусь і Валгаградскай вобласці» намеснік начальніка ўпраўлення міжнароднага супрацоўніцтва Камітэта эканомікі Адміністрацыі Валгаградскай вобласці **Яўген ВАРЛАМАЎ.** Мяркую, што словы найбольш дакладна характарызуюць і сённяшні этап саюзнага будаўніцтва: ад агульных правільных і прыгожых слоў — да справы. Ад высокай паэзіі зноў жа вельмі правільных лозунгаў аб славянскім адзінстве да прыземленай, але дабротнай прозы: а наколькі лепей жыць стане? Дакладна, як убачаная на адной з будаўнічых крамаў рэклама: «1 плітка — 1 рубель».

Навошта Валгаграду цікавіцца беларускімі трактарамі, калі тут ёсць свой трактарны завод? Навошта нам здабываць на далёкай Волзе калійныя ўгнаенні, везці адтуль хімічныя валокны, калі ўсё гэта ёсць і ў нас?

— Ведаеце, сёння няма такога паняцця, як, напрыклад, выключна беларускі аўтамабіль ці валгаградскі трактар, — падкрэслівае **Рыгор Зубкевіч**, кіраўнік аддзялення Пасольства Беларусі ў Паўднёвай федэральнай акрузе Расіі. — Нікуды не падзецца ад нашага агульнага мінулага, калі Беларусь была зборачным цэхам у тым жа цяжкім машынабудаванні. Сёння МТЗ, напрыклад, супрацоўнічае з 250 прамысловымі прадпрыемствамі Расіі. Ці ўзяць нашы БелАЗы. Яны зараз ажыццяўляюць 40 працэнтаў грузаперавозак у Расіі, і разам з тым да 60 працэнтаў іх кошту — расійскія складовыя. На трактарах прыкладна такая ж статыстыка. Чыйго вытворцу падтрымлівае Расія, купляючы наш трактар? І свайго ў тым ліку. Вось вам і эканамічная мэтазгоднасць любой інтэграцыі і любога саюза. Таму кіраўніцтвам Беларусі ўзяты накірунак на развіццё рэгіянальнага супрацоўніцтва, і Паўднёвая федэральная акруга тут стаіць адразу пасля Масквы і Санкт-Пецярбурга.

На думку Рыгора Зубкевіча, беларусам варта актыўна ўкараняцца і на будаўнічым рынку Расіі. Зараз тут шырока разгортваецца праграма «Даступнае жыллё», і трэба не палохацца, браць удзел у таргах, тэндарах, выйгравць іх. У нас жа выдатныя спецыялісты, тэхналогіі. Для гэтага, вядома, патрэбна адпаведная рэклама, інфармацыя.

— Наогул інфармацыя — тавар першай неабходнасці, — лічыць саветнік Пасольства Беларусі ў РФ **Іван Карэнда**. — Любыя кантакты, і перш за ўсё эканамічныя, будуць паспяховымі ва ўмовах добра развітай інфармацыйнай прасторы. Сёння ў Беларусі можна атрымліваць па падпісцы больш за 4 тыс. расійскіх друкаваных выданняў, а зваротны працэс — зусім іншы: вельмі сціплая колькасць нашых газет і часопісаў змешчана ў расійскіх каталогах. Між тым людзі актыўна цікавяцца працэсамі, што адбываюцца ў абедзвюх дзяржавах: калі Пасольства Беларусі адкрыла свой сайт у Інтэрнэце, яго сталі наведваць штодзень да 10 тыс. чалавек, а ў дні, калі, напрыклад, адбываўся візіт прэзідэнта Расіі ў Беларусь, іх лік вырастаў утрая.

Намеснік кіраўніка Дэпартамента замежных, рэгіянальных сувязяў і знешнепалітычнай дзейнасці Адміністрацыі г. Валгарада **Уладзімір Малаў** не раз бываў у Беларусі і лічыць: мы генетычна звязаныя паміж сабой, таму агульную мову знаходзім вельмі хутка. Беларусь не разгубіла свае высокія тэхналогіі, і сёння не варта выканходзіць веласіпед, калі можна скарыстацца напрацоўкамі суседзяў. Абмен звесткамі пра інвестыцыйныя праекты, аналіз попыту і прапаноў прадпрыемстваў, турызм — тут для спецыялістаў, занятых у стварэнні агульнай інфармацыйнай прасторы, шмат працы. Асабліва важная — інфармацыя на ўзроўні чалавечых узаемаадносінаў. А найбольш цікавыя прэкты фінансуюцца з бюджэту Саюзнай дзяржавы, расказаў намеснік начальніка Дэпартамента фінансаў і бюджэтнай палітыкі Пастаяннага камітэта **Анатоль Ігнацьеў**.

Пасля грунтоўных тэарэтычных дэбатаў мы падышлі, вядома, і да мясцовых газетных кіёскаў. У дні нашага прыезду ў прэсе актыўна абмяркоўвалася тэма куплі для кіраўніка мясцовай мэрыі эксклюзіўнага аўтамабіля «Аўдзі» А8 за 4 млн рублёў. Газета з кідкай назвай «Маё!» падлічыла, што кожнаму валгаградцу гэта абышлося ў 4 рублі. Нітка да ніткі, як кажуць... Ды і наогул валгаградцам неяк не шанцуе з аўтамабілямі. Скандал з набыццём «Toyota Land Cruiser» для начальніка абласнога ГУУС Міхаіла Цукрука абышоў у тым ліку і цэнтральныя выданні, на генерала завялі крымінальную справу. Зараз здабываюцца суды. А двума гадамі раней скандальная гісторыя разгарэлася з тагачасным мэрам Яўгенам Ішчанкам — сам у сябе купіў патрапаны жыццём «Мерседэс»... Сапраўды, калі інфармацыя — тавар, то газета — таксама, і прадае яе кожны як умее.

Беларусь — дзяржава марская

Такую выснову мы зрабілі, пабываўшы ў адкрытым акцыянерным таварыстве «Валгаграднафтамаш». Якім жа іншым шляхам дабраліся б звышмагутныя рэактары, што вырабляюцца тут, да горада Мазыра, дзе выкарыстоўваюцца для вытворчасці сучасных марак бензіну на нафтаперапрацоўчым заводзе? Волга, Дон, Азоўскае і Чорнае моры, адтуль па Дняпры і да Прыпяці не так далёка, — стаім на заснежаным прычале і, як зараз кажуць, віртуальна прасочваем шлях шматтонных вырабаў для нашай нафтаперапрацоўкі, якія «адчальваюць» з Валгарада. Яны даплываюць не толькі да Прыпяці — і да Дзвіны, у Наваполацк. Туды таксама ідуць звышцяжкія рэактары, а «Белтрансгаз» замаўляў тут «шаравыя краны», як гаворацць мясцовыя профі. Прадукцыя вельмі ёмістая не толькі па расходзе металу, але і па ўкладанні працы: рэактар можа вырабляцца не адзін год!

Біяграфія завода пачынаецца з 41-га года, калі ўся вытворчасць была нацэленая на адно: працаваць на Перамогу! Найбольшы лік працуючых — 8 тысяч чалавек — тут быў у дапарабудоўныя часы, калі ў аб'яднанне ўваходзілі 4 заводы і 2 інстытуты. Потым трэсла, як і ўсіх: стала не да навукі, катастрафічна не хапала заказаў. За што толькі ні хапаліся: нават каўпакі для аўтамабільных колаў з нержавейкі выраблялі (хоць увесь свет выкарыстоўваў на гэтыя мэты пластык).

Расказвае пра гэта намеснік дырэктара завода Аляксандр Хрысёў і ўсміхаецца. Добра яму ўсміхацца: сёння такіх паспяховых прадпрыемстваў у вобласці не многа. Ходзім па цэхах, глядзім на тыя рэактары, што хутка будуць у Мазыры, гутарым з рабочымі. Заработкамі задаволеныя, ёсць свае базы адпачынку на моры, прафілакторый, падсобная гаспадарка, нават пякарня з каўбасным цэхам. Будуеш кватэру — прадпрыемства выдае крэдыт пад смешныя (з майго пункту гледжання) паўтара працэнта на тэрмін да 10 гадоў. Працуючых — 5 400 чалавек. Гэта людзі, якім пашанцавала тут застацца. Як удалося выплысці? Скажу толькі адно: 51 працэнт акцый таварыства належыць добра знаёмаму нам «Газпраму».

— Таму такіх прадпрыемстваў вы знойдзеце ў нас не так і многа, — расказваюць рабочыя. — Мяняюцца ўласнікі, закрываюцца заводы, а хто церпіць перш за ўсё? Самі ведаеце.

Між тым маёмасныя войны ў волжскім рэгіёне яшчэ далёка не завершаныя. І галоўны выявода тут — рынак. У горадзе закрыты амаль усе прадпрыемствы дрэваапрацоўкі, і нават знакамітыя трактарны завод выпускае ў год толькі 3 тысячы трактароў (параўнайце з 60 тысячамі нашага МТЗ).

— Таму з 2004 года наша стратэгія ў плане эканамічных прыярытэтаў стала іншай, — расказвае начальнік упраўлення развіцця прадпрымальніцтва Адміністрацыі Валгаградскай вобласці Уладзімір Дзямідаў. — Гэта — малы і сярэдні бізнэс. Разважалі так: моцны і шырокі сярэдні клас — стабільнасць у грамадстве.

Сёння ў вобласці 15 тысяч малых прадпрыемстваў, больш за 65 тысяч фермераў (без уліку наёмных рабочых), або трэць эканамічна актыўнага насельніцтва вобласці. Да 2010 года плануюць давесці долю малога бізнэсу ў валавым унутраным прадукце рэгіёна да 15 працэнтаў пры ўдзеле 45 працэнтаў занятага насельніцтва. Асабліваю падтрымку атрымліваюць так званыя амбіцыйныя праекты — лізыкоўкі, але вельмі выгадныя. А з гэтага года ключавыя словы загучалі крыху па-іншаму: узяліся за сярэдні бізнэс.

«Дайце пажыць!»

— Мы дружна падтрымалі Пуціна, або «Адзіную Расію», не таму, што мы такія палітызаваныя, не таму, што нехта моцна апрацоўваў ці нешта абяцаў. Ведаеце, проста пажыць хочацца, — заўсёды ўсмешлівы і вясёлы наш вадзіцель Генадзь прамаўляе гэта вельмі сур'ёзна. — Мы пачалі жыць. Мы сталі прыносіць дадому нармальныя грошы. Не стала гэтага бязмежжа — дзе хто што ўхапіў, кагосьці абагнаў. Усё ж гэта на нервах, на крыўдах. Цяпер працуеш нармальна, вучышся — цябе цэняць. На адной і той жа пасадзе маеш вышэйшую адукацыю — атрымліваеш ледзь не ўдвая больш. Ведаеш замежную мову — зноў даплаты. Ёсць куды імкнуцца. Мы сталі думаць пра добрую адукацыю для дзяцей. Мы ездзім на адпачынак сталі! Вось вы сабе зараз парфуму ў нас купілі. Здаецца, дробязь, а гэта ж цэлая філасофія. Калі ў маёй жонкі добра-такі псуецца настрой, яна ідзе і купляе сабе «новы водар». Вядома ж, французскі. І я шчаслівы! Мне падабаецца, што яна прыгожа апранаецца, што нашы дзеці ходзяць ва ўсе гэтыя басейны-музычолы — куды ім цікава. Ну якая мне розніца, каму належыць вось гэты супермаркет з чатырма басейнамі, більярдамі-саўнамі, дзіцячымі гарадкамі і бязлічу тавараў? Мне выгадна рабіць тут пакупкі — вось і ўвесь мой інтарэс. Таму дарэмна вы іранізуеце над вынікамі выбараў: нам па горла хапіла перадзелаў, маёмасных войнаў, фінансавых землятрусаў. Каб не ўсё жыццё хоць на гэта пайшло.

...Ад'язджаючы ранкам з гасцініцы, звярнула ўвагу на змену лозунгаў на цэнтральнай плошчы. Замест выбарнай тэматыкі там з'явілася ёлка і пажаданні дабра і шчасця валгаградцам у новым годзе. Далучаюся!

Людміла ВЕРАСНЁВА.

P.S. *У самалёце разгортваю прапанаваную ў аэрапорце газету «Новые деловые вести». Увагу прыцягвае вялікае інтэрв'ю з генеральным дырэктарам валгаградскага завода «Будмаш», намеснікам старшыні гарадской думы, Ганаровым металургам РФ Валерыем Васільковым. «У жанчынах цаню розум і самастойнасць.» Стойце-стойце, нешта ж вельмі знаёмае прозвішча... Так і ёсць, наш чалавек! «Бацькі шмат гадоў працавалі на трактарным. (Бацька — родам з Беларусі, таму нярэдка мы з малодшым братам лета праводзілі ў Магілёўскай вобласці... Дзедаў дом стаяў на ўскраіне вёскі ў акружэнні саду, у якім было шмат вуллёў... Недалёка раскінуўся вялікі луг, па краі якога працякала рэчка і стаялі паткія стагі сена...» Ну хоць ты самалёт разварочвай — мы, лічы, раслі на адной рэчцы, толькі ў розным цячэнні. Больш за тое — прозвішчы ў нас аднолькавыя: у Валерыя Дзянісавіча — па бацьку, у мяне — па маме... Але гэта ўжо — тэма новых даследаванняў і падстава для новых сустрэч. Такіх супадзенняў, мяркую, нямала ў людзей, якія мелі адну гісторыю, адну вайну, адну краіну.*

Інфарм-укол

ВЫРАТАВАЛЬНЫЯ ПЯЦЬ ПОРЦЫЙ

У вучоных няма сумненняў, што аматарам расліннай ежы не так і страшныя атэрасклероз і звужэнне артэрый, якія могуць прывесці да сардэчна-сасудзістых захворванняў і сардэчных прыступаў. Дыетолагі рэкамендуюць ужываць не менш за пяць порцый агародніны і садавіны. Прычым порцыяй лічыцца адзін невялікі яблык ці апельсін, шклянка ягад, напрыклад, вінаграду ці маліны, шклянка фруктовага соку або дзве поўныя лыжкі салаты з агародніны. Калі ўжываць такую колькасць садавіны і агародніны штодня, можна забяспечыць арганізм неабходнымі мікраэлементамі і вітамінамі. Зразумела, не абавязкова абмяжоўваць сябе гэтымі пяццю порцыямі, можна ўжываць столькі агародніны, колькі хочацца — шкоды не будзе. Самымі карыснымі прадуктамі лічацца памідоры, балгарскі перац, сельдэрэй, спаржа і капуста, прычым усіх відаў.

АД КАХАННЯ ДА НЯНАВІСЦІ — АДЗІН КРОК...

Даволі спрэчнае сцвярджэнне. Чалавек, які любіць, не пачынае помсціць, праклінаць і ненавідзець, нават калі партнёр нанёс яму наймацнейшы маральны ўдар здрадай ці пакінуў яго. Уменне дараваць нават самыя крыўдныя ўчынкі і грахі — і ёсць каханне. У такіх сітуацыях нельга прыслухоўвацца ні да чаго, акрамя голасу ўласнага сэрца. Развітанне як лакмусавая папера праявіць сапраўдныя пачуцці да таго, хто вас пакінуў. Ёсць некалькі варыянтаў развіцця падзей у такой сітуацыі. Але правільны, напэўна, адзін. Калі той, каго вы ўсё яшчэ кахаеце, усвядоміў памылку і вырашыў вярнуцца, варта прыняць пакаянне і дараваць. І ні слова папроку. Кожны мае права на памылку. А зразумець, хто нам сапраўды дарагі, мы можам толькі ў параўнанні.

Вядучая рубрыкі Святлана БАРЫСЕНКА.

НАДВОР'Е на заўтра

...у суседзяў

18 студзеня

1288 год — 720 гадоў таму завяршылася ўзвядзенне Камянецкай вежы (Камянецкі слуп, Белая вежа) — унікальнага помніка абарончага дойлідства канца XIII стагоддзя. Як пішуць аўтары Іпацьеўскага летапісу, 30-метровая вежа закладзена на рацэ Лясная па загаду валынскага князя Уладзіміра Васількавіча майстрам Алексай як памежны апорны фарпост. У 1503 годзе прывілеяй караля польскага і вялікага князя літоўскага Аляксандра гораду Камянцу дараваўся герб з выявай гэтай вежы.



1943 год — прарыў блакады Ленінграда, якая доўжылася 871 дзень. За гэты час загінулі (у асноўным ад голаду) каля 1 мільёна жыхароў.

«Мужчыны звяртаюць увагу на тое, што пра іх думаюць, а для жанчын важней — што пра іх гавораць».

Тэадор Готліб Хіпель (1741—1796), нямецкі пісьменнік.

ЧАТЫРЫ ЗАМЕСТ ШАСЦІ

Колькасць удзельнікаў хакейнага турніру «Кубак Палесся», які пройдзе з 6 па 9 лютага ў Гомелі і Жлобіне, скарацілася да чатырох, паведамляе прэс-служба Федэрацыі хакея Беларусі: засталіся зборныя Беларусі, Даніі і Славеніі. Ад удзелу адмовіліся расіяне і зборная Латвіі. Замест пецярбуржцаў прыедзе зборная Казахстана. Арганізатары знялі з выступлення зборную Палесся і змянілі формулу турніру.

Усміхнёмся!

Як патлумачыць іншаземцу фразу: «Рукі не даходзяць паглядзець»?

☺

— А мяне ўчора сабака пакусаў!

— Шалёны?

— Не, нармальны. Стаў бы я шалёнага за хвост цягнуць!

☺

Маленькія хітрыкі.

Каб цацкі не ламаліся, не давайце іх дзецям!

☺

— У чым карысць ад гасцей і тараканаў?

— У сувязі з іх адходам робіцца прыбіранне.

☺

У адзін дзень з фестывалем піва прайшоў фестываль кавуноў. У чэрвах людзі страчвалі прытомнасць.

☺

— Усім добрай раніцы. Леначка, зрабіце мне, калі ласка, каву!

— Іван Іванавіч, каву робяць у Лацінскай Амерыцы, а я яе проста гатую.

— Лена, разумнічаць трэба было ў школе на экзаменах, тады б ты працавала, а не насіла б каву.

У суд Драгічынскага раёна Брэсцкай вобласці паступіла заява аб прызнанні адсутным без вестак **ТАЛКАЦЭВІЧА Алега Васільевіча**, 1976 года нараджэння, які нарадзіўся ў горадзе Бярозе Брэсцкай вобласці, да восені 2003 года пражываў у горадзе Бяроза па вул. Савецкай, 39—15, беспрацоўны.

Просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі пра Талкацэвіча Алега Васільевіча, паведаміць іх суду Драгічынскага раёна Брэсцкай вобласці на працягу двух месяцаў з дня апублікавання аб'явы.

Не плачце, а паглядзіце

Некалі, каб патрапіць на выставу Аляксандра Ісачова, трэба было прастаяць некалькі гадзін у вялізнай чарзе. Імя мастака гучала вельмі часта, ён стаў вядомай асобай. Пра яго шмат пісалі і нават з'явіўся дакументальны фільм Анатоля Алая «Не плачце па мне...», праўда, гэта было ўжо пасля заўчаснай смерці Ісачова.

Месяцавы каляндар садова-агародных работ

Аб уплыве Месяца на расліны вядома яшчэ з антычных часоў. Менавіта з гэтай планеты звязаны прыліўныя і адліўныя з'явы акіянскіх і марскіх водаў, а таксама ваганні электрамагнітных палёў, якія ўплываюць на надвор'е.

Нашы продкі ведалі толькі пра дзве фазы гэтай планеты — растучую і ўбываючую, а калі стала развівацца вучэнне аб Месяцы, яго ўплыве на зямное жыццё, кожную фазу падзялілі яшчэ на дзве і такім чынам атрымалася чатыры.

Лічыцца, што пасля маладзіка (у пачатку першай фазы) сокі і энергія пачынаюць рухацца ад каранёў да верхавіны, узмацняецца рост наземнай часткі. У другой фазе (ад пачатку першай чвэрці да поўні) пажыўнымі рэчывамі насычана верхняя частка раслін, у такім стане яны захоўваюцца да трэцяй фазы (ад поўні да пачатку апошняй чвэрці). Паступова па меры старэння Месяца (на працягу чацвёртай фазы) усе сокі паступова назапашваюцца ў каранях. Вельмі важна садзіць і сеяць расліны ў такія фазы Месяца, якія садзейнічаюць іх росту і развіццю.

На расліны аказваюць уплыў не толькі фазы Месяца, але і іх становішча ў знаках Задыяка. Садзіць лепш, калі Месяц знаходзіцца ў сузор'ях Цяльца, Рака, Шаляў, Скарпіёна, змагацца з пустазеллем — у знаках Авена, Блізнятаў, Стральца, Вадалея. Перамяшчэнне Месяца ў сузор'е Рака — спрыяльны час для паліву і прышчэпак, знаходжанне ў сузор'і Льва — для касьбы, Вадалея — для знішчэння шкоднікаў.

СПРЫЯЛЬНЫЯ ДНІ ДЛЯ СЯЎБЫ, ПАСАДКІ АГАРОДНЫХ КУЛЬТУР

Культуры	*студзень*	*люты*	*сакавік*	*красавік*	*май*	*чэрвень*	*ліпень*	*жнівень*	*верасень*	*кастрычнік*	*лістапад*	*снежань*
Агуркі,	20, 21	8, 9, 17, 18	11—13, 16	7, 8, 11, 12, 17—19	5, 6, 13, 14	8—10, 13—15	5—8	7—9	4, 5, 14	1—3, 11, 12, 30	7—9	5, 6
Бабы (гарох, боб, фасоля)	—	—	—	11, 12, 15, 16	7, 8, 12, 18, 19	6, 8—10, 15—19	5, 6, 11—16	4, 9—13	5—9	1—5, 14, 30	7—9, 12	5, 6, 9, 10
Баклажаны	—	8, 9, 16, 17	11—13, 16	7, 8, 11, 12, 18, 19	15—18	13—15	8—10, 13—15	—	—	—	—	—
Бульба	—	—	2, 3, 22, 23, 26—30	23 —27	4, 21—24	1, 2, 19—21, 28—30	25—27, 30, 31	22, 23, 26, 27	18, 19, 22—24	15—17, 19—21, 26—28	16, 17, 22—24	13, 14, 20, 21, 24—26
Буракі сталовыя	27, 31	3—5, 23—27	2, 3, 6, 22—26, 29—31	3, 4, 21, 22, 25—27, 30	1, 2, 4, 23, 24, 27—29	1, 2, 19—21, 24, 25, 28—30	21—23, 25—27, 30, 31	17—19, 22, 23, 26, 27	18, 19, 22—24	15—17, 19—21, 26—28	16, 17, 22—26	13, 14, 19—24
Бручка	27—31	3—5, 23—27	2, 3, 6, 22—26, 29—31	3, 4, 21, 22, 25—27, 30	1, 2, 4, 23, 24, 27—29	1, 2, 19—21, 24, 25, 28—30	21—23, 25—27, 30, 31	17—19, 22, 23, 26, 27	18, 19, 22—24	15—17, 19—21, 26—28	16, 17, 22—26	13, 14, 19—24
Дыня, кабачкі, гарбузы	20, 21	8, 9, 17, 18	15, 16	12, 18, 19	8—10, 15—19	5, 6, 11—16	4, 9—13	5—9	1—5, 14, 30	1—3, 11, 12, 30	7—9	5, 6
Капуста ранняя	20, 21	8, 9, 12—14, 17, 18	11, 12, 15, 16	7, 8, 12, 18, 19	6, 8—10, 15—19	5, 6, 11—16	4, 9—13, 16, 17	5—9, 12, 14	1—5, 9, 10, 14, 30	1—3, 6—8, 11, 12, 30	2—4, 7—9, 12, 30	1, 5, 6, 9, 10, 28, 29
Капуста позняя	—	12—14	11, 12	7, 8	6, 17—19	14—16	11—13, 16, 17	7—9, 12—14	4, 5, 9, 10	1—3, 6—8, 30	2—4, 12, 30	1, 9, 10, 28, 29
Капуста чырвоная	20, 21	8, 9, 17, 18	15, 16	12	8—10	5, 6, 16—18	4, 14, 15	10—12	6—8, 14	4, 5, 11, 12, 31	1, 2, 7—9, 28, 29	5, 6
Капуста цвятная	20, 21	8, 9, 12—14, 17, 18	11, 12, 15, 16	7, 8, 12, 18, 19	6, 8—10,15—19	5, 6, 11—16	4, 9—13	5—9	1—5, 14, 30	1—3, 11, 12, 30	7—9, 12	5, 6, 9, 10
Кальрабі	29—31	26, 27	24—26	21, 22	—	—	—	—	—	—	25, 26	22—24
Каляндра	20, 21	17, 18	15, 16	12	8—10, 17—19	5, 6, 14—16	4, 11—13, 16, 17	7—9, 12—14	4, 5, 9, 10	1—3, 6—8, 30	2—4, 30	1, 28, 29
Кроп	18—21	14—18	13—16, 19, 20	9—12, 15—17	6—10, 13, 14, 17—19	4—6, 9—11, 14—16	4, 6—8, 11—13, 16, 17	3, 4, 7—9, 12—14, 31	1, 4, 5, 9, 10	1—3, 6—8, 30	2—4, 30	1, 11, 28, 29
Крэс-салата	20, 21	8, 9, 17, 18	15, 18	12	8—10, 17—19	5, 14—16	4, 11—13	7—9	4, 5, 14	1—3, 11, 12, 30	7—9	5, 6
Морква	1—4, 27—31	23—27	6, 22—26	3, 4, 21, 22, 30	1, 2, 4, 27—29	1, 2, 24, 25, 28—30	21—23, 25—27, 30, 31	17—19, 22, 23, 26, 27	18, 19, 22—24	15—17, 19—21, 26—28	16, 17, 22—26	13, 14, 19—24
Мята	20, 21	17, 18	15, 16	12	8—10, 17—19	5, 6, 14—16	4, 11—13, 16, 17	7—9, 12—14	4, 5, 9, 10	1—3, 6—8, 30	2—4, 30	1, 28, 29
Перац салодкі	20, 21	8 — 9, 17 — 18	15, 16	12	8—10, 17—19	5, 6, 14—16	4, 11—15	7—12	4—8, 14	1—5, 11, 12, 30, 31	1, 2, 7—9, 28, 29	5, 6
Пятрушка каранёвая	27—31	3—5, 23—27	2, 3, 6, 22—26, 29—31	3, 4, 21, 22, 25—27, 30	1, 24, 23, 24, 27—29	5, 6, 14—18	1, 2, 21—23, 25—31	17—19, 11—27	18—24	15—21, 26—28	14—17, 22—26	13, 14, 19—24
Пятрушка ліставая	18—21	8, 9, 12—18	11—16	7—12, 18, 19	6—10, 15—19	1—3, 19—21, 24, 25, 28—30	4, 9—13, 16, 17	5—9, 12—14	1—5, 9, 10, 14, 30	1—3, 6—8, 11, 12, 30	2—4, 7—9, 12, 30	1, 5, 6, 9—11, 28, 29
Памідоры, фізаліс	20, 21	8—12, 17, 18	8—10, 15, 16	12	8—10, 17—19	5, 6, 14—17	4, 11—15	7—12	4—8, 14	1—5, 11—13, 30, 31	1, 2, 7—11, 28, 29	5—8
Радыска	27—31	1—5, 23—29	1—3, 6, 22—31	3, 4, 21—27, 30	1, 2, 4, 21—24, 27—29	1, 2, 19—21, 24, 25, 28—30	21—23, 25—27	17—19, 22, 23	18, 19	15—17, 26—28	22—26	20—26
Рэдзька	27—31	23—27	22—26	5, 21, 22	2—4	1, 2, 26—30	23—27, 30, 31	19—23, 26, 27	16—19, 22—24	15—17, 19—21, 26—28	16, 17, 22—26	13, 14, 20—24
Сланечнік	20, 21	8, 9, 17—20	15—18	12, 15—19	8—12, 15—19	5—8, 11—16	4—6, 9—13	2, 5—9	1—5, 14, 30	1—3, 11, 12, 30	7—9	5—6
Салата качанная	—	—	19, 20	15—17	13, 14	9—11	6—8	3, 4, 31	1	—	—	—
Салата ліставая	20, 21	8—14, 17, 18	8—12, 15, 16	7, 8, 12, 18, 19	6, 8—10, 15—19	5, 6, 11—16	4, 9—13, 16, 17	5—9, 12—14	1—5, 9, 10, 14, 30	1—3, 6—8, 11—13, 30	2—4, 7—12, 30	1, 5—10, 28, 29
Фасоля	20, 21	17, 18	15, 16	12	8—10	5, 6	416, 17	12—14	9, 10	6—8	2—4, 30	1, 28, 29
Цыбуля на пяро	—	10—12	8—10	—	17—19	14—18	11—17	7—14	4—10	1—8, 13, 30, 31	1—4, 10, 11, 28—30	1, 7, 8, 28, 29
Цыбуля на рэпку	29—31	1—5, 26—29	1—3, 24—31	5, 21—27	2—4, 21—24, 30, 31	19—21	23—25	19—21	16, 17	—	25, 26	22—26
Цыбуля чарнушка на сеянку	29—31	1—5, 26—29	1—3, 24—31	21—27	4, 21—24	1—3, 19—21, 28—30	1, 2, 25—29	22—25	18—21	15—19	14, 15, 25, 26	22—26
Часнок	29—31	1—3, 26—29	1, 24—28	5, 21—25	2—4, 21, 22, 30, 31	26, 27	23—25	19—21	16—17	—	25, 26	22—26
ПАСАДКА ПЛАДОВЫХ І ЯГАДНЫХ КУЛЬТУР												
Ажына	—	—	19, 20	15—17	13—14	9—11	6—8	3, 4, 31	1—2	—	—	—
Абрыкос, вішня	—	—	11 — 12	7, 8, 19—19	15—17	11—13, 16—17	9, 10, 14—17	5—7, 10—14	1—3, 6—10, 30	4—8, 31	1—4, 12	—
Агрэст	—	8, 9, 18	15, 16	12	8—10, 17—19	5, 6, 14—16	11—13, 16, 17	7—9, 12—14, 17	4, 5, 9, 10, 14	1—3, 6—8, 11, 12, 30	2—4, 7—9, 30	1, 5—6, 28, 29
Бружмель	—	—	8 — 12, 19, 20	7, 8, 15—17	6, 12 — 14, 17 — 19	9—11, 14—16	6—8, 11—13	3—4, 7—9, 31	1, 4, 5	1—3, 13, 30	10—12	—
Вінаград	—	14 — 16	13 — 14	9 — 11	7, 22—24	4, 16—18	14—17	10 14	6 — 10, 20, 21	4—8, 31	1—4, 28—30	10, 28, 29
Груша, слівa	—	—	11, 12	8, 18, 19	15—17	11—13	9, 10, 16, 17	5—7, 12, 14	1—3, 9, 10, 30	6—8	2—4, 12, 30	1, 9, 10
Маліна	—	—	6, 15—16	4, 12, 21, 30	2, 8—10, 17—19, 27—29	5, 6, 14, 16	4, 11—13, 23	7, 9, 17—19, 26	4, 5, 14, 24	2, 3, 11, 12, 19, 30	7, 16, 17, 25 — 26	—
Парэчкі	20, 21	8, 9, 18—20	3, 15—18, 24, 26	4, 12—15	5, 8—12, 17—19	5—8, 14—16	4—6, 11—13, 16, 17	2, 7—9, 12—14	4, 5, 9, 10, 14	1—3, 6—8, 11,12, 30	2—4, 7—9, 30	1, 5, 6, 28, 29
Суніцы садовыя	—	—	8—10, 13—16	9—12	6—10,17—19	4—6, 14—16	4, 11—13	7—9	4, 5, 14, 17, 20—24	1—3, 11—13, 30	7—11	5—8, 11
Яблыня	—	3, 12—14	2, 3, 11, 12	8, 21, 22, 25—27	17—19, 23, 24	—	—	7—9, 12—14	4, 5, 9, 10, 18	1—3, 6—8, 15—17, 30	2 — 4, 12, 25, 26, 30	—
НЕПАЖАДАНЫЯ ДНІ												
	23, 24	19, 20	17, 18	13—15	10—12	7, 8	4—6	2, 28, 29	24—26	21—23	18, 19	15—17
НЕДАПУШЧАЛЬНЫЯ ДНІ СЯЎБЫ І ПАСАДКІ ЛЮБЫХ КУЛЬТУР												
	22	6, 7, 20, 21	4—6, 7, 21, 22, 31	1, 2, 5, 6, 20, 28, 29	5, 19, 20, 25—27	3, 4, 18, 19, 21—23	2, 3, 18—20	1, 15—17, 30, 31	11—13, 15, 29	9, 10, 14, 15, 28, 29	5—7, 12, 13, 27	2—4, 12, 27, 29—31

ПАСАДКА І ПАСЕЎ ПА ЗНАКАХ ЗАДЫЯКА

Для пасадкі памідораў выберыце дзень Пладоў (Авена, Ільва аба Стральца. Караняплоды (сельдэрэй, моркву, цыбулю, рэдзьку) таксама садзіце ў дзень, калі ўбываючы Месяц знаходзіцца ў сузор'і Авена, Ільва, Стральца. У якасці варыянту можна ўзяць дні Кораня (Дзевы, Цяльца, Казярога). Для пасадкі бульбы карысна, калі Месяц будзе ісці на спад, г.зн. старэць, але ідэальны знак Рыбаў, асабліва калі гэта трэці дзень пасля маладзіка.

Для пасадкі кветак і лекавых траў лепш за ўсё падыходзяць дні, калі малады Месяц знаходзіцца ў сузор'і Блізнятаў, Шаляў, Вадалея.

СЯЎБА ЗБОЖЖАВЫХ КУЛЬТУР

Сяўбу збожжавых лепш за ўсё праводзіць у дні Авена, Стральца і Льва пры маладым Месяцы і дрэнна пры старэючым. **Не рэкамендуецца** пры старэючым Месяцы ў знаку Рыбаў, Рака ці Казярога.

Старайцеся не сеяць ў дні Льва, асабліва ў сухое надвор'е, таму што гэта можа прывесці да яшчэ большага засыхання. Дні Льва добрыя для сяўбы ў тым выпадку, калі зямля вельмі сырая. Калі час быў выбраны правільна, то ў раслін павысіцца супраціўляльнасць да непагоды і шкоднікаў, а ўраджай будзе захоўвацца доўга. Дарэчы, лепшым днём для складзіравання ўраджаю будзе дзень пад знакам Авена.

ПІКІРАВАННЕ

Пасеянае насенне ўзышло. Вы выбралі самыя моцныя ўсходы і зноў садзіце іх на даволі вялікай адлегласці адзін ад другога, але праз некаторы час усе расліны на градцы падаюць і больш не падымаюцца. Вам гэта знаёма? Уся адказнасць за такі вынік ляжыць на Вадалеі ў старэючым Месяцы. Каб гэтага не паўтарылася, пікіраваць расліны трэба пры маладым Месяцы ў дні Пладоў (Авена, Ільва і Стральца).

ПАДРАЗАННЕ РАСЛІН

Лепш за ўсё падразаць расліны пры старэючым Месяцы ў дні Блізнятаў або Стральца, і ні ў якім разе пры маладым Месяцы. Не рэкамендуецца праводзіць гэту працэдуру перад поўняй.

Падрэзваючы расліны пры старэючым Месяцы, вы не прычыніце ім ніякай шкоды, таму што сокі выдзяляцца не будуць. Расліны ў гэты час «не сцякаюць крывёю», а, наадварот, атрымліваюць моцны імпульс да росту і жыцця. Гэтыя правілы можна выкарыстаць для любых раслін, у тым ліку і для дэкаратыўных. Станоўчы эфект ўзрастае па меры набліжэння маладзіка. Што датычыцца зялёнай агароднай, то яе лепш падстрыгаць у дні Лісця (Рака, Скарпіёнаў, Рыбаў), а пладовыя кусты ў дні Пладоў (Авена, Ільва, Стральца).

ПАЛІЎ РАСЛІН

Памятайце асноўныя правілы паліву: **лепш за ўсё:** паліваць 2 — 3 дні пасля пасадкі; **добра:** пасля працяглай засухі ў дні Вады (Рака, Скарпіёна, Рыбаў); **дрэнна:** рэгулярна пры любых умовах; **не рэкамендуецца:** у дні Блізнятаў, Шаляў і Вадалея.

ПРАПОЛКА

Расліны, якія не даюць пладоў, не ўсе можна назваць пустазеллем. Крапіва, снітка, лебяда, наготкі — гэта не пустазелле, хутчэй за ўсё, лекавыя травы. Любому садаводу таксама вядома, што правільна падабраная садружнасць раслін дапамагае ў барацьбе са шкоднікамі. Расліны супрацоўнічаюць адна з другой. Але калі вы ўсё ж дзень вырашылі прысвяціць праполцы, то вазьміце на ўзбраенне наступныя правілы: **лепш за ўсё:** праполку рабіць пры старым Месяцы ў знаку Казярога; **дрэнна:** пры маладым Месяцы; **не рэкамендуецца:** пры маладым Месяцы ў знаку Льва.

У дні Льва стрэлкамі ідзе ўсё пустазелле. Любое, нават самае слабае, насенне можа прарасці. Але ж калі вы распачалі праполку ў гэтыя дні, то проста перакапайце ўсю градку, праполеце пры старэючым Месяцы ў знаку Казярога, і тады тут доўга не будзе пустазелля.

Перад надыходам зімы абавязкова трэба прапалоць усе градкі пры старэючым Месяцы. Гэта падрыхтоўка да наступнага года. Асабліва памятайце: пустазелле, выпалатае да 18 чэрвеня да поўдня, больш не вырасце. Пра гэты пішуць многія крыніцы, але тлумачэнняў няма нідзе. Паспрабуйце — і пераканайцеся самі. Калі час для барацьбы з пустазеллем выбраны правільна, нават карэнне лёгка дастаецца з зямлі.

БАРАЦЬБА СА ШКОДНІКАМІ

Вы захоўваеце тэрміны пасадкі і догляду раслін, а шкоднікі ўсё роўна з'яўляюцца. Вы хочаце пазбавіцца ад нянрошаных гасцей, паспрабуйце выкарыстаць становішча Месяца: **змагацца са шкоднікамі** лепш пры старэючым Месяцы; **са шкоднікамі, якія жывуць у зямлі,** лепш за ўсё змагацца ў дні Каранёў — Цяльца, Дзевы, Казярога; **са шкоднікамі, якія жывуць на зямлі,** трэба весці барацьбу пры старэючым Месяцы ў знаку Рака, хоць можна выкарыстаць таксама знакі Блізнятаў і Стральца.

Ёсць яшчэ адна непрыемная з'ява — смаўжы. Змагацца з імі можна пры дапамозе звычайнага шалупіння ад яек. Пачніце збіраць шалупіне, і калі ў вас будзе яго дастаткова колькасць, здрабніце пры маладым Месяцы. Тады вострых краёў не будзе і кавалачкі пачнуць зліпацца, а ўнутраная абалонка застанецца ліпкай. Пасля гэтага раскідайце кавалачкі шалупіння вакол градкі, якую вы хочаце абараніць, напрыклад, вакол градкі з салатай ці капустай. Рабіць гэта лепш пры маладым Месяцы ў знаку Скарпіёна. У гэтыя дні краі яечнага шалупіння будуць адпужваць гэтых насякомых, арганізмы якіх маюць вельмі адчувальную паверхню. Пры старэючым Месяцы шалупіне знікла б пасля першага дажджу. Гэты спосаб мае некаторыя перавагі: шалупінне не забруджвае глебу і не шкодзіць раслінам. Існуюць і іншыя спосабы: рассыпаць вакол градкі драўнінны попел або апілкі, пасадзіць побач рэпчатую цыбулю, часнок, шалфей ці настурку.

УНЯСЕННЕ ЎГНАЕННЯЎ

Збіраючыся ўгнойваць глебу, звярніце ўвагу на тое, калі гэта рабіць. Пры старэючым Месяцы зямля добра рэагуе на падкормку. Тое ж самае можна сказаць і аб угнаеннях для пакаёвых і балконных раслін. Пры старэючым Месяцы, пачынаючы з поўні, зямля можа прыняць значна больш вадкасці, чым пры маладым Месяцы.

Асноўныя правілы падкормкі: **лепш за ўсё:** у поўню ці пры старэючым Месяцы пад знакамі Рака, Скарпіёна, Рыбаў, а таксама Дзевы, Цяльца і Казярога; **добра:** у поўню і пры старэючым Месяцы; **дрэнна:** пры маладым Месяцы; **не рэкамендуецца:** пад знакам Ільва пры маладым Месяцы, а таксама ў маладзік.

Для развіцця пладоў лепш за ўсё ўгнойваць у поўню і пры старэючым Месяцы пад знакамі Авена, Ільва і Стральца, а таксама Цяльца, Дзевы, Казярога. Заўважце, што ўгнаенні, унесеныя ў глебу пры маладым Месяцы, карысці не прынясуць, да таго ж яны перагружаюць грунтовыя воды, пасля чаго некаторы час піць гэту ваду нельга.

ЛЕКАВЫ ЗБОР

Гаворачы аб лекавых травах, не варта забываць, што гаючая сіла нераўнамерна размеркавана па ўсёй расліне. Існуе час, калі збіраць тую ці іншую траву няма сэнсу, таму што патрэбная частка яшчэ развівацца.

Прыміце пад увагу **асноўныя правілы збору траў.** Лепшы час года — вясна. Расліны ў гэты час яшчэ маладыя, карысныя рэчы лёгка выдзяляюцца. **Карэнне** лепш за ўсё выкопваць ранняй вясной, калі рост раслін яшчэ не дасягнуў піку, або ўвосень, калі тэмпы росту ўжо запавольваюцца. Рабіць гэта трэба пры старэючым Месяцы або ў поўню ў дні Каранёў (Цяльца, Дзевы, Казярога), тады ў іх больш сілы. **Лісце** можна збіраць амаль круглы год, але пры ўмове, калі размова ідзе аб маладых раслінах. Збіраць лісце трэба пры маладым Месяцы, гэта значыць, паміж маладзіком і поўняй у дні Лісця (Рака, Скарпіёна, Рыбаў). Калі травы, сабраныя ў дні Скарпіёна, валодаюць асаблівай сілай, іх лёгка сушыць і можна доўга захоўваць, то травы, сабраныя пад знакам Рыбаў, лепш выкарыстоўваць адразу. Выключэнне складае крапіва, цудоўны сродак, каб ачысціць кроў: яе можна збіраць пры старэючым Месяцы, а гарбату з крапівы піць паміж 15 і 19 гадзінамі. **Кветкі** лепш за ўсё збіраць вясной ці ўвосень. Сонца павінна свяціць ці павінна быць вельмі цёпла, каб кветкі раскрыліся і ў іх трапілі жыватворныя сокі. Збіраць кветкі трэба пры маладым Месяцы, у дні Кветак (Блізнятаў, Шаляў, Вадалея). **Плады** і насенне, сабраныя пры маладым Месяцы, трэба выкарыстаць адразу. Для захоўвання іх лепш збіраць пры растучым Месяцы або пры старэючым Месяцы ў дні Пладоў (Авена, Ільва, Стральца). У дні Казярога, Рыбаў, Дзевы плады лепш не збіраць.

Лекавыя травы для лячэння пэўнага органа, сабраныя, калі Месяц знаходзіцца ў знаку, які кіруе гэтым органам, асабліва эфектыўныя.

УРАДЖАЙ. ПРАДУКТОВЫЯ ПРЫПАСЫ І ІХ ЗАХОЎВАННЕ

Вынікі захоўвання і кансервавання часта аказваюцца рознымі, хоць, здавалася, усё рабілі аднолькава. Гаспадыня заўважае, што толькі што адкрыты слоік з варэннем пакрываецца плесняй, а другі слоік стаіць некалькі тыдняў, а варэнне як свежае. Разгадка вельмі простая — дастаткова прыгадаць, у якім стане быў Месяц.

Такім чынам, лепш за ўсё збор ўраджаю, кансерваванне варта праводзіць пры старэючым Месяцы пад знакамі Авена, Ільва і Стральца. Знак Авена лепш за ўсё падыходзіць для збору ўраджаю збожжавых, агародніны і бульбы, а таксама закладванне яго на захоўванне. Не рэкамендуецца пры маладым Месяцы пад знакамі Рака, Дзевы і Рыбаў.

Тое, што прызначана для сушкі, трэба збіраць пры старэючым Месяцы. У гэты ж час трэба мыць і паліцы, прызначаныя для захоўвання садавіны, тады яны будуць сухімі і на садавіне не з'явіцца плесня.

Здымкі паласы Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 24 31 92, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 74 13 92, Баранавічах: 7 26 02, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03; даведкі па рэкламе і аб'явах тэл./факс: 287 17 79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292 04 52.

http://www.zviazda.by e-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя пакідае за сабой права не ўступаць у перапіску з аўтарамі. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 35.018. Індэкс 63850. Зак. № 305. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12